Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 473. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Навыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц — 90 к. „ 3 „ — 2 р. 70 к. „ 6 „ — 4 р. — к. „ 1 год — 8 р. — к. Зьмена адрасу: іншагародзьня — 20 к. мясцовыя — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок пампарэлі пасьля тэксту — р. 50 к. За радок пампарэлі паперад тэксту 1 р. — к. За радок пампарэлі перад тэкстам 1 р. 50 к. Сьпешныя на 50 проц. даражэй. Зьніж тарыфу бярэцца 10 проц. пялогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 дакумант — 35 кап. За кожны дадатковы — 15 „ Беспрацоўн. і чырвонаармейцы за дакумант — 15 „ За кожны дадатковы — 5 „ Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, ва ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і ва ўсіх пошт.-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

9 ГОД ВЫДАНЬНЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 209 (2397) Аўторак, 11-га верасьня 1928 г.

ПЛЕНУМ БЮДЖЭТНАЕ КАМІСІІ ЦВК БССР АДЧЫНЯЕЦЦА 12-ГА ВЕРАСЬНЯ 1928 ГОДУ А 6 ГАДЗІНЕ ЎВЕЧАРЫ Ў ЗАЛІ ПАСЯДЖЭНЬНЯЎ ЦВК І СНК БССР.

Пакт Келёга і барацьба за разброеньне.

Савецкі ўрад у сваім адказе на запрашэньне далучыцца да пакту Келёга аб забароне вайны процістаўіў патрабаваньне ўсеагульнага ці хоць-бы частковага разброеньня.

Тут сустрэліся дзьве палітыкі: палітыка, якую праводзяць імпэрыялісты з часу Вэрсальскага міру, і палітыка, якую праводзіць савецкая ўлада з першага дня свайго існаваньня.

Усе міратворчыя фокусы імпэрыялізму ў выглядзе Лігі Нацый, міжнародных кангрэсаў і канфэрэнцый аб забесьпячэньні міру, бязпасьнасьці, разброеньні, арбітражы, усе запэўненьні буржуазных урадаў аб іх міралюбіі, а таксама ўтвораныя паміж імі дагаворы і саюзы маюць мэты, у якіх няма нічога супольнага са справай міру.

Гэта перш за ўсё—ашуканства шырокіх народных мас для прыкрыцьця падрыхтоўкі да новых войнаў; затым, гэта—спосаб, каб спіхнуць адзін аднаго і ўмацаваць сваё панаваньне і ўплыў за кошт сваіх ворагаў і, урэшце гэта—шлях да стварэньня адзінага імпэрыялістычнага фронту проці СССР, як „парушыцеля міру“.

Гэткі самы і толькі што падпісаны з вялікай урачыстасьцю пакт Келёга, аб якім Брыян заявіў, што гэта—«новая дата ў гісторыі чалавецтва».

Гэтая думка сучаснага імпэрыялізму нарадзілася ў той момант, калі ўсюды ў буржуазных дзяржавах шпарка расьце ўзброеньне, калі амэрыканскія, ангельскія, французкія, японскія імпэрыялісты адкрыта ажыцьцяўляюць узброенай сілай сваю «нацыянальную палітыку» ў Нікарагуа, Арабіі, Марока, Кітаі і калі ангельска-амэрыканскае спаборніцтва ўзмацняецца з кожным днём па ўсіх лініях міжнародных адносін.

Сам пакт Келёга прыдуман амэрыканскімі імпэрыялістамі з мэтай зьнішчыць Лігу Нацый і замяніць яе новым амэрыканскім «мэханізмам» і тым паслабіць у Эўроце ангельскі ўплыў і замацаваць свой. У гэтых адносінах адваротным бокам келёгаўскага пакту зьяўляецца ўтвораны ледзь не напярэдадні яго падпісаньня васкна-марскі саюз паміж Англіяй і Францыяй, накіраваны проці Амэрыкі.

З свайго боку ангельскія і французкія імпэрыялісты, а таксама іх паслугачы—Польшча і Румынія—падпісаючы пакт, мелі свае асобныя мэты ў адносінах да СССР. Яны разьлічвалі недапусьціць Савецкі Саюз да ўдзелу ў пакце, стварыць вакол яго абставіны адмежаваньня і нацкаваць проці яго грамадзкую думку, як проці ня прымаючага ўдзелу ў такой вялікай справе—„ўсеагульнага ўціхаміраньня“.

У гэтай сваёй частцы пакт Келёга ўжо пацярпеў крушэньне. Сваім удзелам у пакце савецкі ўрад ня даў сябе ізалаваць, ня даў магчымасьці рабіць паклёп перад тварам шырокіх мас што, быццам, СССР—проці забароны вайны.

Але гэтага мала. Падпісваючы пакт, савецкі ўрад атрымаў магчымасьць зноў высунуць свае запатрабаваньні разброеньня, як адзіны рэальны сродак паслабленьня ваеннай пагрозы. Гэта запатрабаваньне імпэрыялісты ўсімі спосабамі сабаціравалі і сабаціруюць. Нават зараз, пасьля падпісаньня пакту, ангельскі прадстаўнік у Лізе Нацый ашуканскім спосабам сарваў абгаварэньне савецкіх прапаноў аб разбраеньні.

Але савецкі ўрад адрасуе гэтыя прапановы не імпэрыялістам, а шырокім масам працоўных, усім тым, хто сапраўды за мір. Ён ім зазначае, за што яны павінны змагацца, каб папярэдзіць ваенную пагрозу.

Падпісваючы пакт Келёга, каб ня даць сябе ізалаваць, а разам з тым выкрываючы яго нікчэмнасьць і ўсюману міратворчай балбатні імпэрыялістаў і сацыял-дэмакратаў, савецкі ўрад атрымаў магчымасьць узмацніць сваю барацьбу за мір, за разбраеньне.

Поўны разрыў з прынцыпам пралетарскага адзінства.

ПАСТАНОВЫ СВАНСІЙСКАГА КАНГРЭСУ—НАЙБУЙНЕЙШАЯ ПЕРАМОГА КАПІТАЛІСТАЎ.

На кангрэсе ангельскіх сацыял-згоднікаў.

СВАНСІ. На пасяджэньні кангрэсу прафсаюзаў ад імя саюзу машынабудаўнічых рабочых пададзена рэзалюцыя з прапановаю генэральнай радзе скліканьць сусьветную канфэрэнцыю прафсаюзаў, якія ўваходзяць у Амстэрдамскі Інтэрнацыянал ці Прафінтэрн, а таксама прафсаюзаў, якія не ўваходзяць ні ў якое з гэтых аб'яднаньняў, з мэтаю ажыцьцёвіць адзінства прафесыянальнага руху ў нацыянальным і міжнародным абхвапе. Да рэзалюцыі была далучана рэзалюцыя саюзу мэханікаў, якая патрабуе аднавіць англа-расейскі камітэт адзінства. Проці рэзалюцыі выступалі Тамас і Торн, якія паўтаралі звычайныя выпады проці СССР. У абарону рэзалюцыі выступалі Коэн (саюз маблёўшчыкаў) і Вільямс (федэрацыя горнарабочых). Правыя дэлегаты федэрацыі горнарабочых нясупынна перарывалі Вільямса выгукамі і перашкодзілі скончыць прамову.

Рэзалюцыя адхілена большасьцю 2.877.000 галасоў проці 430.000.

Меншасьць прафсаюзаў агаласіла маніфэст, у якім зазначана: пастанова кангрэсу проці скліку сусьветнае канфэрэнцыі паказвае, што сучасная кіраўніцтва ангельскім рабочым рухам зьяўляецца самым небясьпечным ворагам рабочых. Капіталістычныя ўрады падтрымліваюць палітыку „міру ў прамысловасьці“ і адначасна рыхтуюць вайну проці СССР. Кангрэс прафсаюзаў у Свансі ўхваліў пастановы, ня маючы паўнамоцтваў радавых сяброў прафсаюзаў. Гэтыя пастановы зьяўляюцца самаю буйнаю перамогаю капіталістаў з часу ўсеагульнае забастоўкі.

Маніфэст прапануе рабочым адхіліць пастановы кангрэсу ў Свансі і змагацца пад кіраўніцтвам новых правадыроў за рэарганізацыю прафсаюзаў Англіі, за адзіны Інтэрнацыянал прафсаюзаў і проці супрапоўніцтва клясаў.

ШТО НЯСЕ РАБОЧЫМ ПАЛІТЫКА ГЕНРАДЫ.

СВАНСІ. У гутарцы з карэспандэнтам ТАСС Кук заявіў. «Вельмі патрэбна растлумачыць рабочым, што палітыка «міру ў прамысловасьці» азначае зьніжэньне заработку, павялічэньне рабочага дню, рост беспрацоўя, перавытворчасьць і, у выніку, вайну. Рэзалюцыя кангрэсу ў Свансі падахвочвае капіталістаў да новага выступленьня. Палітыка левага крыла рабочага руху павінна вывяцца ў аб'яднанай барацьбе проці зьніжэньня заработку, за скарачэньне рабочага дню, лепшую арганізацыю рабочых на прадпрыёмствах і поўную рэарганізацыю форм прафесыянальнага руху Англіі».

КАНГРЭС ЗАЧЫНІЎСЯ.

СВАНСІ, 8-9. Зачыніўся кангрэс ангельскіх прафсаюзаў.

ЛАЦІНСКАЯ АМЭРЫКА НЕ ДАВЯРАЕ ВАШЫНГТОНУ.

АРГЕНТЫНА, БРАЗІЛІЯ І ЧЫЛІ ПА-ЗА ПАКТАМ КЕЛЁГА.

НЬЮ-ЁРК. 8-9. Ранейшыя паведамленні, што аргентынскі сэнат выказаўся за далучэньне Аргентыны да пакту Келёга, направільныя. Наадварот, палі некаторыя сэнатары выступілі за далучэньне да пакту, дык сэнатар Малінгры, які лічыцца прыхільнікам погляду новаабранага прэзыдэнта Ірыгойена, востра выступіў проці далучэньня да пакту, заяўляючы што ён быў прапанаваны Келёгам нашчыра, і што ўся палітыка Злучаных Штатаў у адносінах да Лацінскае Амэрыкі, між іншым, інтэрвэнцыя Паўночна-Амэрыканскіх Злучаных Штатаў у Нікарагуа, супярэчыць пакту.

У палітычных колах Злучаных Штатаў зазнаюць што такім парадкам да пакту Келёга пакуль-што не далучыліся тры самыя буйныя паўдзённа-амэрыканскія дзяржавы: Аргентына, Бразілія і Чылі

ДАЛУЧЭНЬНЕ ТУРЦЫІ ДА ПАКТУ.

АНГОРА, 8-9. Анаталійскае тэлеграфнае агенцтва паведамляе: „6 верасьня пасланьніку Паўночна-Амэрыканскіх Злучаных Штатаў перададзена падпісаная міністрам замежных спраў Тэўфік-Рушды-беем турэцкая нота аб далучэньні Турцыі да пакту Келёга.

ВЫЗВАЛЕНЬНЕ З ЧАНКАЙШЫСЦКІХ КАЗЭМАТАЎ.

15 САВЕЦКІХ ГРАМАДЗЯН ВЫПУШЧАНЫ ДА СУДА З АСТРОГУ.

ПЕКІН, 9-9. 15 савецкіх грамадзян, якія былі зьняволены ў Пекіне ў працягу 17-ці месяцаў, вызвалены па загаду пекінскага пракурора. Усе яны вызвалены пад заклад і пад падпіску не выязьджае з Пекіну да суду; заклад выплачан Дальня-Ўсходнім банкам.

ПЕКІН, 8-9. Сёньня ўсе 15 савецкіх грамадзян вызвалены з астрогу. Дазнаньне па справе, узьнятай проці пекінскага аддзяленьня Дальня-Ўсходняга банку, праводзіцца далей.

Рост прыхільнасьці да СССР у Англіі.

ЛЁНДАН. Камандзір параходу «Трудо», якому перададзены ў Кранштадзе трупы ангельскіх маракоў, загінуўшых у катастрофе лодкі «Л—55», падкрэсьлівае ў лёндонскай газэце выключную ўвагу савецкае ўлады ў адносінах да трупаў.

«Калі-б загінуўшая каманда лодкі, —піша ён,—была з савецкіх грамадзян, дык савецкая ўлада не магла-б тады выказаць большае павагі, чымся ў адносінах да загінуўшых ангельскіх маракоў».

Поруч з экспэдыцыяй «Красіна» савецкія адносіны да загінуўшых ангельскіх маракоў выклікалі значны раст прыхільнасьці да СССР.

Ніякіх зьмен у віленскім пытаньні.

Перамовы між Мюльлерам і Брыянам выявілі, што дачаснае вызваленьне Рэйнскае вобласьці магчыма толькі за грашовую кампэнсацыю з боку Нямеччыны.

На жэнеўскім кірмашы.

Саламонава пастанова аб польска-літоўскай спрэчцы.

ЖЭНЕВА, 8-IX. Рада Лігі Нацый ухваліла рэзалюцыю аб польска-літоўскім пытаньні. Рэзалюцыя кажа, што, у зьвязку з надыходзячымі польска-літоўскімі перамовамі, у ходзе якіх трэба будзе на толькі пацьвердзіць вынікі працы камісій, але і знайсьці вырашэньне праблемы,—меркаваньні рады Лігі аб працы камісій зьяўляюцца заўчасными. У выпадку, калі перамовы не дадуць рэальных вынікаў, дык рада Лігі Нацый даручыць экспэртам рассьледаваць узьнікаючыя ў зьвязку з польска-літоўскім канфліктам перашкоды, якія закранаюць інтарэсы трэціх дзяржаў, і прапанаваць радзе практычныя захады.

Вальдэмарас заявіў, што зазначэньне на інтарэсы трэціх бакоў супярэчыць статуту Лігі Нацый, але фармальна ня выступіў проці рэзалюцыі.

Пасьля выступленьня Брыяна, які дамагаўся ўхвалы рэзалюцыі, яна была ўхвалена аднагодна. Адначасна ўхвалена пастанова, каб на бліжэйшай сэсіі рады Лігі Нацый азнаёміцца з становішчам польска-літоўскіх перамоў.

„Вільня—стратэгічны ключ да Коўні“.

ЗАЯВА ВАЛЬДЭМАРАСА.

ЖЭНЕВА, 9-9. Вальдэмарас у заяве прадстаўніком другу зазначыў, што адною з магчымасьцяў упарадкаваць віленскую праблему зьяўляецца СКЛІК МІЖНАРОДНАЕ КАНФЭРЭНЦЫІ З УДЗЕЛАМ СССР, НЯМЕЧЧЫНЫ І ІНШЫХ ВЯЛІКІХ ДЗЯРЖАЎ, калі яны гэтага захочуць.

Далей Вальдэмарас, спыніўшыся на польска-літоўскіх адносінах, заявіў: „Хоць у Польшчы зараз і панує больш мірны настрой, але не пахавана яшчэ і плян Пілсудзкага злучыць Данцыгскі карыдор з літоўскім і стварыць поўнезалежную Украіну. Вільня застаецца стратэгічным ключом да Коўні. Рыскі ўгавор ня вырашыў пытаньня аб карыдорах, якія павінны вынікнуць, бо існоваваньне іх ня мае сэнсу як з ваеннага, так і з эканамічнага пункту гледжаньня. Нельга забываць, што савецкая ваенная моц перавышае польскую, не зважаючы на саюз Польшчы з Францыяй, ролі якое ў выпадку вайны нельга канчаткова вызначыць».

ПОЛЬСКІЯ ДАМАГАНЬНІ «ТЭХНІЧНАЕ ДАПАМОГІ».

ЖЭНЕВА. Перадаюць, што польская дэлегацыя дамагаецца, каб пры разглядзе польска-літоўскага канфлікту рада Лігі прызнала патрэбнаю «тэхнічную дапамогу» Лігі пры далейшых перамовах між Польшчаю і Літвою і ўстанавіла граніцны тэрмін сканчэньня перамоў.

Калі адновяцца польска-літоўскія перамовы.

ЖЭНЕВА, 9-9. Вальдэмарас і Залескі пагадзіліся пакопт скліку пленуму польска-літоўскае канфэрэнцыі на 3-га лістапада ў Кёнізбэрзе. Вальдэмарас гэтымі днямі выяжджае ў Рым.

ТОРГ З-ЗА РЭЙНУ.

СПАТКАНЬНЕ МЮЛЬЛЕРА З КЕШЭНДЭНАМ.—ІТАЛІЯ „НЕ СУПЯРЭЧЫЦЬ“.

ЖЭНЕВА, 8-IX. Брыян наведаў Мюльлера ў адказ на візыт апошняга. У часе гутаркі Брыян раіў Мюльлеру наладзіць кантакт з прадстаўнікамі дзяржаў, якія ўдзельнічаюць у акупацыі Рэйнскае вобласьці.

Сёньня Мюльлер гутарыў з Кешэндэнам. Ангельская дэлегацыя зазначае, што найбольш зацікаўлена ў рэйнскім пытаньні Францыя, і таму Англія ня будзе супярэчыць проці ўсякае пажаданае для Францыі пастановы.

У італьянскіх колах падкрэсьліваюць жаданьне Італіі пайсьці насустрач нямецкім пажаданьням аб дачаснай эвакуацыі пры адначасным папярэдні абмеркаваньні пытаньня аб кампэнсацыях. Такой кампэнсацыяй лічаць устанаўленьне належачых Італіі рэпарацыйных выплат у разьмерах італьянскага доўгу Злучаным Штатам.

У ЖЭНЕВУ ВЫЕХАЎ СЭКРАТАР ШТРЭЗЭМАНА.

БЭРЛІН, 8-9. «Фосіше Цэйтунг» паведамляе, што рэйхсканцлер Мюльлер наморан выехаць з Жэневы 16 верасьня; з гэтага можна меркаваць, што да гэтага часу будуць скончаны перамовы аб адмене акупацыі Рэйнскае вобласьці.

Далей газэта зазначае, што Брыян, параіў Мюльлеру распачаць асобныя перамовы з прадстаўнікамі дзяржаў, якія ўдзельнічаюць у акупацыі Рэйнскае вобласьці; пры гэтым Брыян заявіў Мюльлеру, што перамовы з прадстаўнікамі дзяржаў-удзельнікаў акупацыі ня будуць мець сэнсу, калі Мюльлер не заявіць, што іменна прапануе Нямеччына замест дачаснага спыненьня акупацыі Рэйнскае вобласьці. Газэта паведамляе таксама, што «становішча ў Жэневе, як відаць, вельмі трывожыць Штрэзэмана», і што з учарайшага дню ў Жэневе—як відаць з інфармацыйнымі мэтамі—знаходзіцца асабовы сэкратар Штрэзэмана.

На дэсэрт—„разброеньне“.

ЖЭНЕВА, 8-IX. Выступаючы на пленарным пасяджэньні сэсіі Лігі Нацый аўстрыйскі канцлер Зэйпель падкрэсьліваў патрэбу «рашучага кроку ў бок разброеньня» і зазначыў пры гэтым, што сучасныя ўзброеньні дзяржаў нашмат перавышаюць даваенны ўзровень.

Далей Зэйпель патрабаваў «павагі да правоў нацыянальнае культуры меншасьцяў».

Пытаньню аб разброеньні прысьвяціў таксама сваю прамову польскі міністр замежных спраў Залескі, які заявіў, што ён не падзяляе «расчараваньня працаю падрыхтоўчае камісіі да канфэрэнцыі аб разброеньні», якое выявілася ў выступленьнях прадстаўнікоў Нямеччыны, Аўстрыі і Скандынаўскіх краёў. «Каб забясьпечыць усеагульны спакой,—кажа Залескі,—дык мала толькі сабрацца ў Жэневе і абвясьціць усеагульнае поўнае разброеньне. Для Польшчы разброеньне—не пытаньне прапаганды, а задача, якая падлягае паступоваму ажыцьцяўленьню ў адпаведнасьці з мэтадамі, якія ўжываліся да гэтага часу».

Літоўскі прэм'ер Вальдэмарас, закрануўшы тое-ж пытаньне, даводзіў, што можна «прывесьці ў юрыдычную сувязь» статут Лігі Нацый і пакт Келёга. «Статут Лігі Нацый, які прадугледжвае магчымасьць вайны,—зазначыў Вальдэмарас,—павінен быць зьменены ў адпаведнасьці з дасягнутаю магчымасьцю юрыдычнае адмовы ад вайны».

Нарэшце, Вальдэмарас падаў рэзалюцыю, якая заяўляе, што сябры Лігі пасьля падпісаньня пакту Келёга ўзялі на сябе новыя абавязацельствы, якія выходзяць за межы статуту Лігі, і даручае радзе Лігі распрацаваць праэкт адпаведных зьмен у статуце. Пададзеная Вальдэмарасам рэзалюцыя перададзена ў камісію па пытаньнях парадку дня.

Няма адназгоднасьці.

ЖЭНЕВА. Пры ўхвале пленумам Лігі Нацый рэзалюцыі, якая прадугледжвае пераабраньне непастаянных сяброў рады Лігі, прадстаўнікі Швэдыі, Нарвэгіі, Галяндыі і Пэрсіі галасавалі проці, а прадстаўнікі паўдзёва-афрыканскага саюзу—устрымаўся.

СЭСІЯ ЗАЧЫНІЛАСЯ.

ЖЭНЕВА, 9-9. 55-я сэсія рады Лігі зачынілася. Чарговая сэсія рады новага складу адбудзецца на бліжэйшым тыдні.

РУХ ПРОЦІ ПАНЦЫРНАЕ ПАЛІТЫКІ МЮЛЬЛЕРА.

ЗАСНОВАН АГУЛЬНАНЯМЕЦКІ КАМІТЭТ ДЛЯ ПРАВЯДЗЕНЬНЯ ПЛЕБІСЦЫТУ

БЭРЛІН, 7-9. Адбылося пасяджэньне падрыхтоўчага камітэту для правядзеньня ўсенароднага галасаваньня аб пабудове панцырнага крэйсэра. Прысутнічалі прадстаўнікі 32-х арганізацый. 10 арганізацый пісьмова паведамілі, што возьмуць удзел у кампаніі.

На пасяджэньні быў абраны агульнанямецкі камітэт для правядзеньня ўсенароднага галасаваньня. Старшынёю абраны Ледэбур. У прэзыдыум увайшоў Мюнцэнбург. Да агульнанямецкага камітэту далучыўся таксама камітэт Кюнстлера, які гэтымі днямі агаласіў адозву проці пабудовы панцырнага крэйсэра за подпісамі праф. Эйнштэйна, пісьменьнікаў Генрыха Манна, Келермана, Цвэйга і інш.

НА АРЭНУ ПРАДАЖНІЦТВА ВЫПУШЧАН КАУЦКІ.

БЭРЛІН, 6-9. Крызіс у нямецкай сацыял-дэмакратычнай партыі, які выбухнуў у зьвязку з пытаньнем аб пабудове панцырнага крэйсэра, выклікаў ажыўленьне фракцыйнае дзейнасьці так званых «левых» сацыял-дэмакратаў, а таксама «цэнтрыстаў». Як адны, так і другія выступаюць проці пабудовы панцырнага крэйсэра і хочуць выкарыстаць настрой радавых сяброў сацыял-дэмакратычнае партыі, каб узмацніць сваё становішча ў кіруючых сацыял-дэмакратычных партыйных установах.

„ФОРВЭРТС“ УТОЙВАЕ ПРАЎДУ АБ НАСТРОЯХ САЦ.-ДЭМ. МАС.

БЭРЛІН 8-9. «Форвэртс» вымушае спрадваздачу аб спэцыяльнай канфэрэнцыі партыйных прапаўнікоў берлінскае арганізацыі сацыял-дэмакратычнае партыі, на якой абмяркоўваліся паводзіны рэдакцыі «Форвэрто» у пытаньні аб панцырным крэйсэры. Нават справаздача „Форвэртс“ паказвае, што спрэчкі выкрылі вострае незадаволеньне шырокіх партыйных колаў паводзінамі цэнтральнага партыйнага органу і яго рэдакцыі.

Дэлегат Генінг паведаміў на канфэрэнцыі, што „Форвэртс“ агаласіў справаздачу на агульным сходзе арганізацыі, да якой ён належыць, не падаючы ўхваленае рэзалюцыі. Пад гучныя знакі адобраньня большасьці Генінг заявіў, што такі спосаб агалашэньня справаздач зьяўляецца нахаб насьцю.

Заява Генінга ўзьняла галас які цягнуўся некалькі хвілін. Некаторыя рашуча патрабавалі зьмяніць склад цяперашняе рэдакцыі «Форвэртс».

Такую прапанову ўдалося адхіліць толькі пасьля падачы рэзалюцыі Кюнстлера, у якой паводзіны «Форвэрто» у пытаньні аб панцырным крэйсэры называюцца «вельмі абняжараючымі» для берлінскае арганізацыі сацыял-дэмакратычнае партыі, і якая заяўляе што пазбавіцца ад супярэчнасьцяў магчыма будзе толькі пасьля таго, як ЦК партыі зараз-жа засуне для берлінскае арганізацыі спэцыяльны орган незалежны ад цэнтральнага партыйнага органу. Рэзалюцыя ўхвалена пераважаючаю большасьцю.

ДЛЯ ПУАНКАРЫСТАЎ І «ПАНЦЫРНЫ» МЮЛЬЛЕР — ПРЫХІЛЬНІК РАЗБРОЕНЬНЯ.

ПАРЫЖ, 8-IX. Увесь друк абмяркоўвае прамову Мюльлера. Некаторыя правыя газэты падкрэсьліваюць блізкасьць палітычных поглядаў Нямеччыны, як яны выявіліся ў прамове Мюльлера, да палітычнае праграмы СССР.

«Фігаро» піша: „Пасьля Літвінава ніхто яшчэ не гаварыў пра разброеньне з большым запалам, чымся Мюльлер“.

Іншыя правыя газэты, абмяркоўваючы магчымасьць дачаснае эвакуацыі Рэйнскае вобласьці, лічаць патрэбным дамагацца ад Нямеччыны кампэнсацыі.

Сьмерць Брокдорф Ранцау.

БЭРЛІН, 10-9. Тыдзень таму назад Брокдорф Ранцау захварэў ангінай, якая адбілася на сэрцы. У суботу становішча хворага раптоўна пагоршала, сэрца часта давала перабоі. Брокдорф Ранцау сказаў асобам, якія знаходзіліся каля яго, што адчувае набліжэньне канца.

У 10 гадзін вечара ўдар, і хворы страціў прытомнасьць. А палове адзінаццатай ён скануў.

АНТЫСАВЕЦКІЯ ПЛЯНЫ „ЦЫВІЛІЗАВАНАЕ“ РУМЫНІІ.

ЯК РАЗУМЕЕ СЭНС ПАКТУ КЕЛЁГА РУМЫНСКАЕ МІНІСТЭРСТВА ЗАМ. СПРАЎ.

ВЕНА, 9-9. У гутарцы з карэспандэнтам «Нойе Фрэйе Прэсэ» часова выконваючы абавязкі румынскага міністра замежных спраў Арджэтояну, закрануўшы палітычныя пытаньні, якія зьяўляюцца актуальнымі для Румыніі, заявіў: «Румынія імкнецца заснаваць сярэдня-эўрапейскае Лёкарно, у якім павінны ўдзельнічаць Польшча, Румынія, Чэхаславакія, Вэнгрыя, Югаславія і Італія. Румынія ў сваёй палітыцы імкнецца, каб выконваліся мірныя ўгаворы і не парушаліся існуючыя саюзы. Саюз з Польшчаю ўлучае сабою спосаб абароны проці расейскае небясьпекі. Удзел Румыніі ў Малой Антанце мае на мэце захаваць мірныя ўгаворы. Румынія ня мае ніякіх падстаў выходзіць з Малое Антанты. Пакт Келёга мае, пераважна, маральнае значэньне. Ніхто ня можа прымусіць дзяржаву, падпісаўшую пакт, ня весьці вайны, калі яна гэтае вайны хоча. Эўропа не павінна ніколі забываць, што Румынія—адзін з галоўных фарпостаў эўрапейскае культуры проці расейскае небясьпекі. Румыніі цяжка разбройвацца, паколькі Румынія павінна ахоўваць межы эўрапейскае культуры. Румынія зьяўляецца таксама тою сьцяною, якая ахоўвае ад бальшавізму і Вэнгрыю. Вэнгрыя павінна была-б гэта ўзяць пад увагу і адмовіцца ад сваіх надзей на рэванш“

Бэсарабія галадуе.

ВЕНА, 7 IX. У Кішынёве адбылася канфэрэнцыя ўсіх бэсарабскіх прэфэктаў. Канфэрэнцыя прайшла сакрэтна.

Канфэрэнцыя адзначыла, што жыхарства акругаў Бэндэр, Кагул і Ізмайла галадуе. Ухвалена паслаць прадукты.

ГВАЛТ НАД БЕЛАРУСКАЙ ШКОЛАЙ У ПОЛЬШЧЫ.

Польскі фашысцкі ўрад зачыніў у Заходняй Беларусі «Т-ва Беларускай Школы»—апалітычную арганізацыю, якая клапацілася аб адчыненьні школ з выкладаньнем на роднай мове.

(З газэт):

У ПАНСКАЙ ПОЛЬШЧЫ.

Прысуд над камуністамі ў Львове.

Пасьля 2-дзённага разбору справы камуністаў, абвінавачаных у выпушчаньні і распаўсюджаньні камуністычных адозваў, львоўскі суд прысудзіў І. Флюга на 5 год катаржнага вастрогу, Маргуліэса С.—на 8 мес., Б. Гольдфарба і Шыммета—па 10 мес.

Арышты камуністаў.

У Клімонтаве арыштавалі гэтымі днямі 6 маладых камуністаў, якія падрыхтоўваліся да сьвяткаваньня МЮД'у. У часе ліквідацыі клімантоўскай ячэйкі адміністрацыя трапіла на далейшыя сьляды арганізацыі і арыштавала яшчэ 10 асоб у вёсцы Абойга.

„Пілсудчыкі“ працуюць...

Гэтымі днямі ў Львове, у кватэры старшыні мяцовага аддзелу эндэцкай партыі залезьлі палітычныя злодзеі, якія перарылі ўсе паперы і забралі партфэль з грашмі, паперамі і сакрэтнай перапіскай.

У львоўскіх палітычных колах думаюць, што гэты палітычны бандытызм, як і шэраг іншых, зроблен „пілсудчыкамі“, якія хацелі даведацца аб сакрэтных справах эндэцыі.

Забастоўка электраманцёраў.

У Варшаве бастуюць электраманцёры. Варшаўская адміністрацыя спыніла дзейнасьць саюзу электраманцёраў, апячатала памяшканьне саюзу і зьвярнулася да пракурора аб зачыненьні саюзу за тое, што ўправа саюзу быццам схіляла сваіх членаў да тэрору ў адносінах да аднаго з прадпрыемцаў.

Забастоўка ў фаянсавых склепах.

Вэтымі днямі ў віленскіх фаянсавых склепах выбухнула на эканамічным грунце забастоўка працуючых там работнікаў. Забаставаўшыя жадаюць 30 проц. падвышкі платы.

Забастоўка ў шкляной гуце.

27 жніўня выбухнула забастоўка ў шкляной гуце ў Кросьне ў абароне варункаў працы і платы.

Забастоўка на панчошных фабрыках.

Гэтымі днямі ў Александраве пачалася забастоўка на панчошных фабрыках. Усе фабрыкі спынілі працу. Забаставаўшыя вымагаюць падвышкі платы.

Канфіскацыя пэпэсаўскай „Пабудкі“.

На месца б. рэдактара пэпэсаўскага тыднёвіка „Пабудкі“ старшыні сойму Дашынскага ўступіў пэпэсавец Зарэмба. Першы нумар «Пабудкі» пад рэдакцыяй Зарэмбы з яго артыкулам, прысьвечаным дажынкам у Спале, пракуратура канфіскавала.

Помнік Э. Ажэшко ў Горадні.

У канцы верасьня г. г. у Горадні будзе адкрыт помнік вядомай польскай пісьменьніцы Элізе Ажэшко.

Пястаўцы і ўрад.

Галоўная ўправа польскай партыі „Пяст“ абгаварвала гэтымі днямі розныя палітычныя пытаньні і вынесла рэзалюцыі, у якіх між іншым выказваецца за адналіты нацыянальны фронт у краі і ў сойме, за зьмену канстытуцыі з мэтаю сапраўднага аздараўленьня парляманцтарызму, аднак не з становішча пераходнай сітуацыі; далейшыя рэзалюцыі абгаварваюць пагаршэньне гаспадарчай сітуацыі, вялікія перавышэньні бюджэту, пагаршэньне земляробчай кан'юнктуры і г. д.

Амністыя Смарагда Латышэнка.

Забойца праваслаўнага варшаўскага мітрапаліта Юрыя архімандрыт Смарагд Латышэнка быў засуджан на 12 гадоў катаргі. На асновe абвешчанай нядаўна ў Польшчы амністыі тэрмін адсідкі зьменшан арх. Смарагду на адну трэць. Ён выйдзе з астрогу ў 1932 годзе.

„Дзеньнік Віл.“ аб т-ве бел. школы.

„Дзеньнік Віл.“ (№ 204) піша, што «мы вы водгук, які зачыненьне дзейнасьці ЦК т-ва бел. школы знайшло ў Менску, найлепш даводзіць, што не толькі палавінчатае зачыненьне дзейнасьці гэтай бальшавіцкай экспазітуры было патрэбным, але бязумоўна патрэбна поўнае зачыненьне камуністычнай арганізацыі пад назвай «т-ва бел. школы».

Справа аб замаху на „генэрала“ С. Балаховіча.

З верасьня акруговы суд у Беластоку павінен быў разглядаць справу Сергея Піпарэвіча, Антона Шпаковіча, Майсея Баўнавыскага і Пэўла Ваўнавысікага, абвінавачаных у прыналежнасьці да КПЗБ і ўтварэньні тэрарыстычнай арганізацыі, мэтаю якой было зрабіць замах на жыцьцё б. правадыра партызанскіх атрадаў у часе польска-савецкай вайны генэрала Станіслава Булак-Балаховіча. Усе абвінавачаныя —беларусы.

Балаховіч на суд не зьявіўся і таму судовая расправа не адбылася.

Лётная катастрофа ў Маладэчне.

6 верасьня здарылася ў Маладэчне лётная катастрофа. Лётнік Уміньскі і назіральнік Навіцкі ўпалі на самалёце з вышыні 50 мэтраў. Самалёт зусім зьнішчан, а з пад яго разьбіткаў выцягнулі ледзь жывых лётнікаў.

Запас замежных валют зьменшыўся.

Запас замежных валют у польскім дзяржаўным банку стала зьменшацца. Пачынаючы ад 1-га студзеня г. г. да 20 жніўня запас валют зьменшыўся на 185,8 мін. злотых.

Абмен палітвязьнямі.

Як паведамляе «Дзеньнік Віл.», пасьля сэсіі Лігі Нацый адбудзецца між Польшчай і Літвою абмен палітвязьнямі. Літва выдасьць Польшчы 21 вывьня з Варнянскага і Ковенскага вастрогаў.

У ЛІТВЕ.

Новыя рэпрэсіі і арышты.

Латвійская газэта «Яўнакас Зінас» паведамляе, што ў мінулую нядзелю (2 верасьня) ў Коўні адбыліся камуністычныя дэманстрацыі, якія былі разагнаны паліцыяй. У шмат якіх месцах Коўні вывешаны былі чырвоныя сьцягі і раскіданы пракламацыі.

Апошнімі днямі амаль ні ва ўсіх паветах зроблены былі новыя арышты прыхільнікаў Плечкайціса. У арыштаваных у Марыямпалі, Жаках і Воўкавышках знойдзена карэспандэнцыя з эмігрантамі ў Вільні. Зроблены таксама рэвізіі і арышты ў Тэльшах, Расіенах і Таўрогене. Арышты знаходзяцца ў сувязі з набліжэньнем гадавіны паўстаньня ў Таўрогене і Аліце.

Крывавая сутычка літоўскай паліцыі з рабочымі.

4 верасьня ў Расіенах дайшло да крывавай сутычкі рабочых з паліцыяй. Перад канторай капальні торпу сабраўся вялікі натоўп рабочых, якія дамагаліся выплаты заработкаў. Кантора адмовіла ў выплаце. Натоўп накіраваўся тады ў бюро дырэкцыі. Выкліканая паліцыя стала разганяць рабочых і калі ёй гэта не ўдалося, дала першы стрэл у паветра, а другі ў натоўп. 1 работнік забіты і 8 паранены. 1 паліцыянт цяжка паранены і 7 паранена лёгка.

Нарада прыбалтыйцаў.

РЭВЕЛЬ, 7-9. У Жэневу выехаў эстонскі міністр замежных спраў Рэбанэ. Пры адъезьдзе Рэбанэ заявіў, што

ЦК КП(б)Б.

Мы, работніцы і сялянкі ва ўрачысты час сканчэння працы нашых курсаў грамадчыц горача вітаем праваднра працоўных Савецкай Беларусі—КП(б)Б.

Толькі пад ленінскім кіраўніцтвам камуністычнае партыі сталі магчымымі тыя посьпехі ў сацыялістычным будаўніцтве, якія зрабіла Савецкая Беларусь.

Накіраваныя партыяй на цьвёрдым пралетарскім шляху саветы разгортваюць сваю вялізарную работу па гаспадарча-культурнаму будаўніцтву краіны, залучаючы ў гэту работу шырокія працоўныя масы.

Падмацаваўшыся новымі ведамі і вопытам савецкага будаўніцтва і падняўшы свой агульны культурна-палітычны ўзровень, мы, грамадчыцы-слухачкі курсаў ЦВК БССР, абяцаем па звароце ў свае гарады і вёскі не пакладаючы рук працаваць над узмацненьнем сацыялістычнага будаўніцтва на мясцох, аддаць усе свае веды і сілы на справу палепшаньня работы саветаў і ўсямерна дапамагаць работніцам і сялянкам, якія пакуль яшчэ адсталі, зрабіцца актыўнымі ўдзельніцамі будаваньня нашай сацыялістычнай бацькаўшчыны пад кіраўніцтвам КП(б)Б.

Няхай жыве саюз рабочых і сялян!
Няхай жыве кіраўнік гэтага саюзу—Ленінскі КП(б)Б!

У Саюзе ССР.

РАЗЬВІТАНЬНЕ ЛЕНІНГРАДЦАЎ З ДЭЛЕГАЦЫЯЙ КАМІНТЭРНУ.

ЛЕНІНГРАД. Частка дэлегатаў кангрэсу Камінтэрну выехала заграніцу. На ўзьбярэжжы зышліся дэлегацыі фабрык, заводаў і піянэрскія атрады. Адбыўся мітынг. З разьвітальнымі выступалі т. т. Кашэн і Цыммэр. Асіпшы ад шматлікіх выступленьняў, т. КАШЭН сказаў, што ён у ЛЕНІНГРАДЗЕ ПАКІДАЕ НЯ ТОЛЬКІ СВОЙ ГОЛАС, АЛЕ І СЭРЦА.

А 7-й гадз. увечары параход „Прэйсэн" з чужаземнымі таварышамі адплыў з Ленінграду.

ДЭЛЕГАТЫ НА «КРАСНЫМ ПУЦІЛАЎЦЫ».

ЛЕНІНГРАД. На «Красны Пуціловец» перад сканчэньнем працы прыехалі т. т. Молатаў, Тэльман і кітайскія дэлегаты на кангрэсе Камінтэрну.

Непарушная вернасьць КІМ'у клясавай барацьбе.

ВЫСТУПЛЕНЬНЕ Т. БУХАРЫНА НА КАНГРЭСЕ КІМ'а.

МАСКВА. 8-га верасьня ўвечары на кангрэсе КІМ'у выступіў з дакладам т. Бухарын. Воплескі дэлегатаў некалькі хвілін не давалі яму гаварыць. Бухарын зрабіў паўтарагадзінную прамову аб міжнародным становішчы і аб выніках кангрэсу Камінтэрну. Заключныя словы Бухарына былі пакрыты буйнымі воплескамі і сьпевам „Інтэрнацыяналу".

Кангрэс ухваліў па дакладу Бухарына рэзалюцыю, у якой далучаецца поўнасьцю да пастаноў кангрэсу Камуністычнага Інтэрнацыяналу і заяўляе ленінскі Камінтэрн у сваёй непарушнай вернасьці.

ПАЗЫКІ РАСКУПЛЕНА НА 180 МІЛІЁНАЎ.

МАСКВА, 8-9. Водлуг папярэдніх, далёка няпоўных вестак агульная сума падпіскі на 2-ю пазыку індустрыялізацыі па СССР (апроч Туркмэнскае ССР) складае 180 міліёнаў рублёў.

Прыезд польскае гандл.-прам. дэлегацыі.

МАСКВА. У Маскву прыехала польская гандлёва-прамысловая дэлегацыя, якая накіроўваецца на Ніжагародзкі кірмаш. З гэтым самым поездам у Маскву вярнуўся польскі пасланьнік у СССР Патэк.

Назначэньне т. Л. Б. Каменева.

МАСКВА. Згодна загаду ВСНГ СССР тав. Л. Б. Каменеў назначан старшынёю калегіі навукова-тэхнічнае ўправы ВСНГ СССР. Намесьнікам яго назначан тав. В. М. Сьвярдлоў.

М. Горкі вярнуўся ў Маскву.

МАСКВА. 8-га верасьня равіцою Горкі прыехаў з Ленінграду ў Маскву. Бліжэйшыя паўтара-два тыдні, як загадваюць дактары, ён будзе адпачываць.

Новы гандлёвы прадстаўнік СССР у Аўстрыі.

МАСКВА. Саюзны СНК назначыў т. Біткер гандлёвым прадстаўніком СССР у Аўстрыі, вызваліўшы яго ад абавязкаў намесьніка гандлёвага прадстаўніка СССР у Нямеччыне.

Увага тэхнічнай асьвеце ў РСФСР.

МАСКВА. Распрацаваны галоўнаю ўправаю вышэйшых тэхнічных навучальных устаноў каштарыс на 1928-29 г. прадугледжвае ўвядзеньне значных сум на запросіны выдатных чужаземных вучоных для чытаньня лекцый у вышэйшых тэхнічных навучальных установах. Па згодзе з прафсаюзам, устаноўлены новыя штаты прафэсуры з такім разрахункам, што на кожнага прафэсара прыпадае слухачоў на 30 проц. менш, чымся да гэтага часу. Гэта павінна павысіць якасьць выкладаньня.

Уводзяцца новыя штатныя адзінкі для выкладаньня чужаземных моваў.

Пэнсія прафэсуры павялічваецца на 30 проц. Павялічваецца і разьмер стыпендыі студэнтам да 35-40 руб. (замест ранейшых 25-27 руб).

ВЕСТКІ АДУСЮЛЬ.

НЕПРАВЕДЗЕНЫЯ Ў ГЕНЭРАЛЬНУЮ РАДУ.

ЛЁНДАН, 8-IX. Пры перавыбарах генэральнае рады прафсаюзаў на кангрэсе ў Свансі не пераабраны Тэрсель (саюз маблёўцаў), Брэдлі (саюз пажарных) і Уоркер (саюз сельска-гаспадарчых рабочых).

За Кука было пададзена менш галасоў, чымся пры леташніх выбарах.

УДЗЯЧНАСЬЦЬ АНГЕЛЬСКАГА ЎРАДУ.

МАСКВА, 8-IX. Нарвэскі пасланьнік пан Урбі выказаў Літвінаву ўдзячнасьць ад імя ангельскага ўраду за ўвагу і дапамогу савецкае ўлады пры перадачы трупаў ангельскіх маракоў, якія загінулі ў падводнай лодцы «Л—55».

НОВАЕ МІЛІТАРЫСЦКАЕ МІНІСТЭРСТВА Ў ФРАНЦЫІ.

ПАРЫЖ, 5-9. Агенцтва Гаваса паведамляе: «Францускі ўрад ухваліў заснаваць міністэрства паветранага флёту».

МАНЭЎРЫ АНТАНТАЎСКІХ ВОЙСК НА РЭЙНЕ.

ПАРЫЖ, 5-9. Сёньня раніцою ў райёне Трэвэсу ў Рэйнскай правінцыі распачаліся штогоднія вайсковыя манэўры. Камандуе манэўрамі генэрал Гюлёма.

У складзе францускага войска ўдзельнічаюць у манэўрах таксама 2 ангельскія палкі.

КУК ЗАНЯДУЖАЎ.

ЛЁНДАН, 8-IX. Дактары загадалі каб Кук адмовіўся ад усякае працы, прынамсі, на месяц.

Па Беларускай ССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

Папы праводзяць сваё "самаабкладаньне".

У вёсцы Любівічах, Шклоўскага райёну, царкоўная кампанія на чале з папом Духоўскім пры актыўным удзеле заможнікаў Дзяткова і г. д. пачалі праводзіць сваё «самаабкладаньне» на адбудову царквы.

Самымі шчодрымі ахвяравальнікамі зьявіліся багацейшыя сяляне. Некаторыя не пашкадавалі на «божий храм» па 10 і болей рублёў. Некаторую частку давала і беднота...

Адбудоўка гэтай царквы цягнецца каля 2-х гадоў. І за гэты час ні мясцовая партыйная ячэйка, ні культасьветныя працаўнікі, ні камсамольцы ні разу не пацікавіліся, што перад іхнім носам самапраўна без дазволу ператвараюць у «храм божий» камунальны будынак.

А сельсавет на працягу двух гадоў глядзеў на рамонт царквы так, быццам гэта яго саўсім ня тычыцца.

І толькі зараз у прэзыдыуме райвыканкому пастаўлена пытаньне аб самавольным захопе царкоўнікамі камгасаўскіх будынкаў.

А З вёскі ўжо вынесьлі свае пастановы аб неабходнасьці перадачы царквы пад школу.

Гарадоцкая партыйная ячэйка пачала агітацыю і па другіх вёсках.

Магілеў. А. Лясны.

20000 пар гусей—на экспарт.

Магілеў, 10-9. Сёлета акруговы сельсаюз рашыў арганізаваць на Быхаўшчыне адкормачны пункт гусей. Пункт адкрываецца пры Саняжынскім птушкаводніцкім таварыстве. У бягучы сэзон (асеньні) будзе адкормлена 20 тысяч пар гусей. Па дагавору з Сельсаюзам, таварыства прыступіла да пастройкі будынку для пункта. Пасланы агенты для закупкі гусей.

Пасьля адкормкі гусі будуць у замарожаным выглядзе адпраўлены заграніцу.

Новае мерапрыёмства выбівае глебу з-пад ног прыватнага гандляра гусямі, які добра зарабляе на гэтай справе.

45.000 беднаце.

МАЗЫР, 10-9. Мазырскі акрстрах разьмеркаваў па райёнах 45.000 руб. на прадастаўленьне льгот беднаце па абавязковаму страхаваньню.

42.000 РУБ. ПАДАТКУ—ДА ТЭРМІНУ.

МАГІЛЕЎ, 10-9. За час да абавязковых тэрмінаў здачы падатку (да 1 верасьня) па акрузе паступіла звыш 42 тысяч рублёў.

ТОЛЬКІ ХОЦІМСКАЕ.

МАГІЛЕЎ, 10-9. На ўсесаюзны конкурс крэдытнае кампаніі з усяе Беларусі выдучана і прадстаўляецца адно ТОЛЬКІ ХОЦІМСКАЕ КРЭДЫТНАЕ ТАВАРЫСТВА Магілеўскае акругі.

ВЫПЛАЦІЛІ 1000 Р. СТРАХОЎКІ.

МАЗЫР, 10-9. Мазырскі Акрстрах выплаціў 1000 руб. па сьмяротнаму выпадку, за ўтануўшага ў часе купаньня міліцыянэра Жыткова В. В., які быў застрахаваны ад нешчасных выпадкаў у 1000 руб.

АШЧАДНАЯ СПРАВА РАЗЬВІВАЕЦЦА.

Гомель, 8-9. Ашчадная справа ў акрузе разьвіваецца. Лік укладчыкаў штомесяц павялічваецца. На 1-е верасьня ў касах ашчаднасьці акругі лічылася 14.700 укладчыкаў на суму ўкладаў 1.001.082 руб. У параўнаньні з мінулым месяцам лік укладчыкаў павялічыўся на 1.512, а сума ўкладаў на 19.733 руб.

Добра разьвівае працу Дабруская фабрычная каса ашчаднасьці, якая ўцягнула 300 новых укадчыкаў. У райёнах здавальняюча працавалі Церахоўская і Ўваравіцкая каса ашчаднасьці. Адстаюць Буда-Кашалёўская і Камарынская касы ашчаднасьці.

НА КАРЫСЬЦЬ ЗАМЕЖНАГА КАМСАМОЛУ.

Бабруйск, 4-IX. У сувязі з МЮД'ам камсамольскімі ячэйкамі Бабруйску праведзены былі суботнікі на карысьць літоўскага і кітайскага камсамолу. На пільні № 6 суботнік даў 140 руб., на фанэрным заводзе 90 руб. Усяго суботнікі дадуць па гораду 1000 р.

СЯЛЯНЕ ЎБАЧЫЛІ КАРЫСЬЦЬ ЯСЬЛЯЎ.

Дужа цяжка было ўгаварыць сялянак в. Смалякі, Кубліцкага с.-с., каб яны запісалі дзяцей у ясьці. Ледзь спачатку запісалі 16 дзяцей.

Але пасьля, калі ўбачылі што ясьлі дапамагаюць ім, вызваляюць на час працы наплыў дзяцей стаў надзвычайна вялікі.

Цяпер у ясьлях 25 дзяцей. Наведваюць рэгулярна.

Вушацкі р., Полаччына.

БУДУЕМ ВЭТЛЯЧЭБНІЦУ.

Мазыр, 8-IX. Мазырскі акрстрах выдзеліў 7.000 руб. на пабудову вэтэрынарнай лячэбніцы ў мястэчку Лельчыцах з сродкаў адпушчаных праўленьнем Дзяржстраху на меры барацьбы з морам на жывёлу.

Добра скарысталі сродкі.

Самаабкладаньне па Сьцяпскаму сельсавету было праведзена па ўсіх вёсках на 35 проц., што для некаторых вёсак зьяўляецца вялікім дасягненьнем.

Грошы былі ўнесены грамадзянамі, амаль, што своечасова.

У наступны момант на сродкі самаабкладаньня ў вёсцы Сьцяпах адрамантавана школа, у якой зроблен капітальны рамонт і набыты клясныя рэчы і канчаткова абаруданы пажарны абоз. У вёсцы Салоціно пабудаваны дзьве грэблі і набыта пажарная машына з неабходным інвэнтаром. У вёсцы Селішча таксама набыта пажарная машына з усім інвентаром і пастаўлены грамадводы.

Парыцкі райён, Бабруйшчына.

Асьветнікі—на 100 пр.

ЛЮБАНЬ, 8-9. Працаўнікі асьветы Любаньскага райёну пастанавілі падпісацца на 2-ю пазыку індустрыялізацыі на 100 проц. свайго месячнага заработку.

Загатовілі 70 вагонаў яблык.

МАГІЛЕЎ, 10-9. Пачалася нарыхтоўка яблык у арцелях і другіх сельска-гаспадарчых аб'яднаньнях якія ўжо атрымалі ад акрсельсаюзу авансы на гэтую мэту.

Усяго будзе нарыхтована 70 вагонаў яблык, пераважна зімовых гатункаў—антонаўкі. 65 вагонаў адгружаюцца па нарадах Белсельсаюзу, які 30 вагонаў накіроўвае заграніцу.

Для мясцовых патрэб магілеўскі цэнтральны рабочы каапэратыў закупіў рэшту—5 вагонаў.

Арганізавалі арцель.

ВОРША, 9-9. Сяляне вёскі 2-ое Заважаньне, Багушэўскага райёну нядаўна арганізавалі арцель па вырабу санак, дуг і іншых сельска-гаспадарчых прылад для патрэб у сельскай гаспадарцы.

Арцель матар'ялам забясьпечана ў дастатковай колькасьці і зараз прыступіла да працы.

Яшчэ—„земляныя" дровы.

МАГІЛЕЎ. На вялізным гадылсўскім балоце, што на Быхаўшчыне, сёлета ідзе здабыча торфу. Пракапана канава ў 2 вярсты ўдоўжкі і ў сажань глыбінёю. Торф будзе скарыстаны Грудзінаўскімі млынам ды броварам. Торфараспрацоўкі ведзе Перакладавіцкае мэліарацыйнае таварыства.

Сэкцыі пры сельсавеце не працуюць.

Больш году прайшло, як у Крупіцкім сельсавеце, Самахвалавіцкага райёну (Меншчына) арганізаваны сэкцыі, але працы іх зусім ня відаць. Вясковы актыў і некаторыя члены сэкцый прымаюць удзел у правядзеньні розных кампаній рэвалюцыйных сьвят але няма сталай плянавай працы, за адсутнасьцю добрага кіраўніцтва. Сельсавет таксама слаба дапамагае працы сэкцый і вельмі слаба сочыць за выкананьнем правядзеньня сэкцыямі тых ці іншых мерапрыёмстваў. На пленумах сельсавету ніколі ня ставілася пытаньне, каб падштурхнуць працу сэкцый. Неабходна Ганнаполь - Крупіцкай ячэйцы КП(б)Б дапамагчы сельсавету падняць працу сэкцый, а РСК праверыць працу апошніх.

Самахвалавічы, Меншчына.

Дзіцячая камуна.

Абсьледваньне Ўсебеларускай дзіцячай камуны ў Магілеве закончана. Зроблены вывады і дадзены паказаньні аб далейшай працы.

Камуна ўсебакова вывучана.

Гэта вывучэньне выявіла станоўчыя і, асабліва, адмоўныя яе бакі.

Дасягненьні камуны — дасягненьні гаспадарчага характару. Камуна ўзмацніла сваю гаспадарку, пераходзіць на шматпалёвы севазварот, палепшыла паляводзтва і жывёлагадоўлю.

Наогул, матар'яльнае становішча досыць моцнае (уласныя будынкі, значная плошча зямлі з вялікім садам, 4 майстэрні, школа-сямігодка) і зусім дастатняе, каб на гэтым грунце пабудаваць узорную гаспадарку і паладзіць належнае выхаваньне дзяцей.

Якраз гэта апошняе (выхаваньне дзяцей) і кульгала на абедзьве нагі. У першым годзе свайго існаваньня камуна аддала галоўную ўвагу свайму гаспадарчаму будаўніцтву. Выхаваўчая праца была другараднай справай, і ў ёй хутка выявіліся вельмі хваробныя зьявішчы. Да гэтага далучылася яшчэ наліччa дефэктыўных дзяцей і перароскаў.

Выхаваўчы пэрсанал, наогул, не аказаўся на вышыні. Сталае сыстэмы выхаваўчае працы ня было выпрацавана. Выхаваньне ня было ўвязана з сельска-гаспадарчымі і іншымі вытворчымі працэсамі. Сярод выхавальнікаў узьніклі склокі, якія праходзілі на вачох у дзяцей. Ужываліся непэдагагічныя меры ўзьдзейнічаньня на дзяцей (застаўленьне без абеду, накшталт «карцэру» ў халодных калідорах, дзёрганьне за вуха, лаянкі з дзяцьмі), якія паказвалі поўную няпрыгоднасьць паасобных выхавальнікаў да даручанай ім справы.

У выніку абсьледваньняў камуны прыняты наступныя арганізацыйныя меры. Загадчыку камуны пастаўлена на від няпрыняцьце мер да ліквідаваньня склок і непэдагагічных «мэтадаў» узьдзейнічаньня на дзяцей. Звольнен загадчык выхаваўчай часткі і 4 супрацоўнікі, адна настаўніца пераведзена ў другую школу. Гарадзкому інспэктару нарасьветы аб'яўлена прэзыдыумам акрвыканкому вымова і кіраўніку піянэр-руху пастаўлена на від—за недагляд за працай камуны.

ЦЭНТРАЛЬНАМУ ВЫКАНАЎЧАМУ КАМІТЭТУ БССР.

Першыя пры ЦВК БССР курсы жанчын-грамадчыц, канчаючы сваю працу, шлюць прывітаньне і шчырую падзяку арганізатару і кіраўніку курсаў вышэйшаму органу Рэспублікі—Цэнтральнаму Выканаўчаму Камітэту Беларусі.

Яшчэ УП Усебеларускі Зьезд Саветаў адзначыў вялізарную ролю ўдзелу жанчын-работніц і сялянак у савецкім будаўніцтве, адзначыў дасягнутыя ў гэтай справе значныя выніні і паказаў на неабходнасьць далейшага разьвіцьця і ўзмацненьня мерапрыёмстваў па ўцягненьні жанчын у савецкае і грамадзкае будаўніцтва.

Урад БССР наступнага вёў і вядзе работу па залучэньню працоўных жанчын у савецкае будаўніцтва і адшуканьню лепшых спосабаў гэтага залучэньня. Адным з такіх канкрэтных мерапрыёмстваў ураду зьяўляецца арганізацыя курсаў, якія мы зараз окончылі.

Мы запоўніваем Цэнтральны Выканаўчы Камітэт БССР, што атрыманыя на курсах веды мы злучым з практычнай савецкага будаўніцтва на мясцох, каб дасягнуць новых перамог нашай краіны на шляху да сацыялізму.

Няхай жывуць, разьвіваюцца і мацнеюць саветы рабочых і сялян!
Няхай жыве Цэнтральны Выканаўчы Камітэт БССР!
Няхай жыве Саюз ССР!

САЦЫЯЛЬНЫ ТВАР ТАЛСТОГА.

(Да 100-годзьдзя з дню нараджэньня).

Леў Мікалаевіч Талстой—вялікі мастак: ён напісаў выключныя творы сусьветнай літаратуры. Спакой мудрага чалавека і палкасьць высьвядчальніка, глыбокая мастацкая праўдзівасьць выяўляюцца з кожнага яго радку. Піша ён пра Баграціёна, ці Напалеона, пра канаючага Сяргея Левіна, ці пра Анну Карэніну—усюды мастацкая праўда змушае верыць пісьменьніку, ісьці за ім, згаджацца з ім.

Стыль і мова Талстога, пабудова твораў, гістарычныя падзеі і літымнае перажываньне яго гэрояў—адзіны маналіт. Усё жыве сваім жыцьцём.

Ня будзем спыняцца на асабістай драме Талстога, па яго супярэчнасьцях. Рэаліст і містык, аб'ектыўны сацыяліст і Ціханава Пустэча, непрацўленьне злу і «не магу маўчаць»—усё гэта супярэчнасьці, якія адбіваюць сілу і слабасьць, магутнасьць і слабасьць сялянскага руху ў былой царскай Расеі.

Нас цікавіць іншае: як адбіўся сацыяльны твар Талстога ў яго мастацкай творчасьці?

Возьмем лепшае з яго твораў «Вайна і Мір». На вялікім палатне Талстой дасканала малюе цэлую эпоху. Шмат гістарычных асоб, падзей. Барадзінскі бой, адступленьне, праца штабаў, уцяканьне абшарнікаў, інтымнае жыцьцё дзесяткаў асоб..., але дарэмна вы будзеце шукаць жыцьцё самога народу. Яго амаль зусім няма ў «Вайне і Міру». Цэмра прыгону, сялянскія непарадкі, адвечная барацьба сялянства з абшарнікамі—гэтага няма ў «Вайне і Міру». На двох-трох старонках Талстой апавядае аб адным сялянскім «бунце» пры набліжэньні армії Напалеона. Але як гэта бледна, карыкатурна ў параўнаньні са ўсім творам!

Водлуг думкі Талстога, «мужычкі» проста заблазнавалі. Досыць было багатаму афіцэру, Мікалаю Растову, зьбіць аднаго „бунтаўшчыка", як усё было ліквідавана. Сяляне нават узрадаваліся гэтаму выяўленьню права багатага афіцэра-абшарніка.

Кіраўнічы князёўны Балконскай пачціва дакладвае афіцэру графу Растову.

— «Адважуся далажыць, найяснейшы пан, што грубы народ тутэйшы ня хоча выпусьціць паню з маёнтку і пагражае разпрагчы коні, з самай раніцы ўсё спакаванае і яснавяльможная пані ня можа выехаць».

Шалёная нянавісьць заліла Растова, калі ён даведаўся аб падрабязнасьцях гэтай змовы прыгонных. Ён накінуўся на кіраўнічага.

— Ты чаго глядзеў? Га? Мужыкі бунтуюць, а ты ня ўмееш справіцца? Ты сам—здраднік... Ведаю я вас, скуру спушчу са ўсіх...

— Я іх пазмагаюся—бясэнсна прыгаварыў Мікалай, задыхаючыся ад неразумнай, нялюдзкай злосьці і патрэбы выліць гэту злосьць.

У чым выяўляецца бунт мужыкоў? Князёўна Мар'я сьпяшаецца выехаць з маёнтку. Яна загадала нагрузіць на сялянскія вазы сваю маемасьць, але сяляне ня выконваюць загаду «законнай» абшарніцы. Стараста тлумачыць, што няма коняй.

— Усё ад божай кары,—кажа Дрон. Якія коні былі, у войска забралі, а некаторыя падохлі: сёлета год такі. Ня то, каб коні карміць, а каб самім з голаду не прапасьці! І так па тры дні ня еўшы сядзімо. Няма нічога, зруйнавалі дашчэнту».

Далей Талстой апавядае, як добрая князёўна хацела дапамагчы панскім хлебам сялянам.

Чула і па-добраму гаварыла князёўна з сваімі прыгоннымі, але тыя ўпёрліся і ня хочуць панскай міласьці—хлеба.

— «Чаго згаджацца-та, ня трэба нам хлеба.

— Што-ж нам усё пакінуць так? Не, ня згодны... ня будзе нашай згоды. Мы цябе шкадуем, а згоды нашай ня будзе. Ад'яжджай сама, адна—кажуць у натоўпе з розных бакоў.

— Глядзі, навучыла лоўка, за ёй ў прыгон ідзі! Сваё кінь, ды ў кабалу ідзі. Як-жа? Я хлеб зьвярну! —чуюцца галасы ў натоўпе.

Вось да гэтых узбунтаваўшых сялян накіраваўся Растоў.

Ён, як належыць «праўнаму» абшарніку, выклікаў з натоўпу старасту, папярэдне зьбіў аднаго селяніна, які ня зьняў шапкі перад панам.

— Шапкі з галавы, здраднікі!—крыкнуў паўнакроўны голас Растова. — Дзе стараста — надрываючыся крычаў ён.

— Старасту, старасту кліча... Дрон Захарыч вас,—пачуліся дзе-ні-дзе пакорлівыя галасы, і шапкі пачалі зьнімаць з галоў.

— Нам бунтаваць немагчыма, мы парадкі захоўваем,—казаў Карп, і некалькі галасоў ззаду ў той-жа момант загаварылі разам:

— Як старычкі пастанавілі, многа вас, начальства...

— Разгаварваць? Бунт! Разбойнікі! Здраднікі!—бяз сэнсу не сваім голасам закрычаў Растоў, хапаючы за карк Карпа, — вяжы яго, вяжы!—крычаў ён, хоць і ня было каму вязаць апроч Лаўрушы і Алпатыча.

Зьвязалі старасту на загаду Растова. Мужыкі адразу здаліся.

— Што-ж мы ніякай крыўды не зрабілі. Мы толькі, значыцца, па несьвядомасьці. Толькі недарэчнасьцяй нарабілі... Я-ж казаў, што непарадкі, —папракалі адзін другога...

Сяляне пачалі каяцца. «Хіба-ж можна так з панамі гаварыць?»,—сьмяюцца над набітым Карпам сяляне.

«А праз дзьве гадзіны падводы сталі на дварэ багучараўскага дому. Мужыкі жвава выносілі і складалі на падводы панскія рэчы, і Дрон, па жаданьню князёўны Мар'і, выпушчаны з рундука, куды яго замкнулі, стоячы на двары, кіраваў мужыкамі».

Вось гісторыя мужыцкага бунту па Талстому. Досыць было зьвяіцца маладому абшарніку—афіцэру графу Растову «з паўнакроўным голасам» абшарніка, і ўвесь бунт быў зьліквідаваны.

А як Талстой разьмеркаваў свой матар'ял? З аднаго боку, добрая, чулая князёўна, прыгожы Растоў, рашучы, адважны, а па другі бок—дурны, палахлівы натоўп, які сам чакае, каб яго білі і вязалі.

Чым тлумачыць такія адносіны Талстога да сялянскіх непарадкаў, якія былі ў 1812 г., у часе наступу Напалеона?

Талстой—не падкуплен абшарнікамі. Ён пісаў так, як думаў, і зусім ня імкнуўся дагадзіць абшарнікам. Але ён сын сваёй клясы, ён—дваранін, граф, ён выконваў сацыяльны заказ.

N.

ТЫЛ І ФРОНТ НАШЫХ СУСЕДЗЯЎ.

Вопыт сусьветнай вайны паказаў, што шматмільённыя арміі, якія прымаюць удзел у барацьбе, могуць маневраваць і нармальна весьці сваю працу толькі пры ўмовах максымальнага разьвіцьця вытворчых сіл, транспарту і ўсіх сродкаў сувязі, якімі ўладае краіна. Асабліва яскрава гэта вызначылася ў часе вайны 1914-18 г. г., калі разьвіцьцё колькасьці армій дасягнула максымальных разьмераў. Так, напрыклад, у працягу сусьветнай вайны ў армію было ўзята ў Англіі—10,7 проц., у Францыі—21,1 проц., Нямеччыне—20,4 проц., у старай Расеі—9 проц. усяго насельніцтва.

Піякі генэральны штаб ці вайсковае міністэрства ваюючых краін не маглі прадбачыць характару будучай вайны і ўсе лічылі, што праз 3—4 месяцы пасьля ня пачатку вайна будзе скончана, і таму ніхто з іх ня меў пляну выкарыстаньня гэткіх чалавечых рэсурсаў. Калі ў працэсе вайны выявілася, што хутка яе скончыць нікому ня ўдасца, і што ява можа зацягнуцца на больш доўгі час, дык усе ваюючыя краіны пачалі папаўняць колькасьць сваіх армій усё новымі і новымі мабілізацыямі. У армію пачалі браць усіх мужчын чарговых узростаў, не зважаючы, якое месца забраныя ў салдаты займаюць у вытворчым арганізьме краіны. (У армію ня бралі толькі паліцэйскіх, найбольш буйных чыноўнікаў ды рознага роду асоб, якія хабарам і ашуканствам заставаліся ў тылу).

У выніку гэтага ў армію былі забраны значныя кадры кваліфікаваных рабочых, што вельмі дрэнна адбілася на вырабе рэчаў шырокага ўжываньня і, галоўным чынам, на вырабе рэчаў, патрэбных для вайны. Гэтак, напрыклад, у Францыі ў выніку толькі першых мабілізацый у жніўні 1914 году з агульнага ліку 46.976 прадпрыёмстваў засталося працаваць толькі 25.502. Колькасьць рабочых у гэтых прадпрыёмствах у жніўні 1914 г. скарацілася з 1.637.166 чал. да 534.387.

Усякага роду мабілізацыі значна зруйнавалі прамысловасьць і аднавіць яе магчыма было толькі паступова ды з вялікімі перашкодамі. Сусьветная вайна запатрабавала вялізарнага ўжываньня агнявых прыпасаў і ўзброеньня, і ніякія запасы не змаглі гэтыя патрэбы здаволіць. Посьпехі і паражэньні на франтох, галоўным чынам, залежалі ад вытворчасьці ў тылу.

Тэтым тлумачыцца тое, што, урэшце, на выраб рэчаў вайсковага спажываньня пачалі зьвяртаць больш увагі. Пачалося разгортваньне ваеннай прамысловасьці. Да кастрычніка 1914 г. у Францыі колькасьць прадпрыёмстваў, якія знаходзіліся пад кантролем „міністэрства ўзброеньня і даставак", дасягнула 9200 адзінак, а ў 1917 годзе гэта колькасьць узрасла да 15.500 адзінак.

У сувязі з разгортваньнем ваеннай вытворчасьці ўзрасла і патрэба ў кваліфікаваных рабочых. Аб тэмпе павялічэньня колькасьці рабочых і мабілізаванай прамысловасьці Францыі сьведчаць наступныя лічбы: на артылерыйскіх заводах Францыі, калі ўзяць асноўны лік рабочых за 100 на 2 жніўня 1914 году, дык 10-VII 1915 г. было 500, 10-III 1916 г.—800, а 1-X 1916 г. ужо 960. На тыя самыя лічбы ў Ліонскім райёне «парахавых службаў» было 100, 850, 1900 і 2440. Наогул, у жніўні 1914 г. у Францыі ў «ваеннай вытворчасьці» было занята ўсяго каля 45.000 чал. У канцы вайны гэта колькасьць узрасла да 1.800.000 чал. Для таго, каб укамплектаваць мабілізаваную прамысловасьць, прышлося адкамандіраваць з войска значны лік раней мабілізаваных кваліфікаваных рабочых. Напрыклад, да 1918 г. францускай арміяй было назад вернута ў тыл 1.500.000 чалавек для розных работ у прамысловасьці, капальнях, чыгунках, сельскай гаспадарцы і г. д. Такім чынам, фактычна ў армії было выкарыстана толькі 16,6 проц. усяго насельніцтва Францыі. Краіна і армія вельмі дорага запляцілі за тое, што кіруючыя дзяржаўныя органы загадзя не змаглі прадбачыць характару будучай вайны. Мабілізацыя зруйнавала вытворчасьць, якую пасьля прышлося аднаўляць у значнай меры рукамі тых-жа самых мабілізаваных.

Вайна паказала, што значная частка кваліфікаваных рабочых дае куды большую карысьць, працуючы на фабрыках і заводах, чымся яны былі-б у войску. Вопыт сусьветнай вайны паказаў, што колькасьць дзейнічаючай армії знаходзіцца ў шчыльнай сувязі з колькасьцю і працай прадпрыёмстваў, што засталіся ў тылу і, наогул, ад матар'яльных рэсурсаў (ад ваеннай вытворчасьці краіны, калі апошняя не атрымлівае ўсё з-за межаў, што, наогул, вельмі цяжка ў часе вайны).

Вышэй мы прыводзілі аснаўныя весткі пра Францыю, у якой ваенная статыстыка настаўлена вышэй, чымся ў іншых краінах. У іншых эўрапейскіх краінах, якія прымалі ўдзел у вайне, прыблізна быў той-жа самы малюнак агульных мабілізацый і наступных «адкамандіраваньняў». На ваеннай вытворчасьці ў сусьветную вайну было занята ў Англіі 2 міліёны чалавек, у Злучаных Штатах Паўночнай Амэрыкі—1.600.000 чалавек, у Італіі — 600.000 чалавек і г. д.

Сучасныя арміі вымагаюць ня толькі шмат матар'яльных выдаткаў, але і шмат чалавечых рэсурсаў. Страты армій у сусьветную вайну вызначаюцца наступнымі лічбамі: Францыя—забітых 1380 тыс., параненых—2800 тыс.; Нямеччына—забітых 1980 тыс., параненых—4500 тыс.; Аўстра-Вэнгрыя—забітых 1440 тыс., параненых 1980 тыс.; Англія—забітых 725 тыс., параненых—2760 тыс.

Гэтыя лічбы нас вучаць таму, што найбольшыя страты арміі цярпелі ў часе манэўравага пераходу вайны, калі абодвы бакі шукалі спосабу як хутчэй яе скончыць; у 1916-17 г., калі, галоўным чынам, вялася пазіцыйная вайна, калі ваенныя апэрацыі адбываліся толькі час-ад-часу на нязначных вучастках фронту, тады процант страт быў найменшы; у 1918 г., калі ваюючыя бакі з надзвычайным напружаньнем імкнуліся скончыць вайну, спрабуючы зламаць пазіцыйныя франты і дамагчыся свабоды манэўраў, страты павялічыліся да нормаў 1914 году.

Такім чынам, вопыт вайны вучыць нас, што дзяржавы, якія вядуць вайну, павінны ў першы-ж год вайны даць на кожны мільён чалавек дзейнічаючай арміі папаўненьні ў 750000 чал. Мільённыя мабілізаваныя арміі штогод вымагаюць мільённых папаўненьняў.

На падставе вывучанага вопыту сусьветнай вайны, мы можам прасачыць і разгледзіць тыя рэсурсы, якія маюць нашы заходнія суседзі ў выпадку вайны з СССР. Адночыс нам прыходзілася давесьці, што нашы заходнія суседзі ў выпадку вайны змогуць супроць нас выставіць 120 дывізій войска.

А якая будзе колькасьць мабілізаванай арміі? Колькі кваліфікаваных рабочых будзе ў першы пэрыяд вайны адарвана ад прадукцыйнай працы?

У сусьветную вайну 1914-18 г. г. на адну пяхотную дывізію прыпадала наступная колькасьць асоб (едакоў): ва ўсёй мабілізаванай нямецкай арміі было на дывізію 33500, з іх у баявым кадры—19900; у францускай—47000, з іх у баявым кадры—25000, у расейскай—33000, з іх у баявым кадры—28000. Улічваючы зьмяншэньне асобнага складу сучасных дывізій ваеннага часу ў параўнаньні з сусьветнай вайной, а таксама некаторую „рацыяналізацыю» тылавых аддзелаў, мы ўмоўна дапушчаем, што на кожную пяхотную дывізію ў будучай вайне прыпадзе каля 30000 «едакоў» усёй мабілізаванай арміі. Такім чынам, агульная колькасьць мабілізаваных армій нашых заходніх суседзяў у першыя месяцы вайны складзе каля 3.600.000, прычым у баявых кадрах каля 70 проц. колькасьці мабілізаваных.

Адсюль мы бачым, што ў выпадку вайны мы на нашых заходніх межах сустрэнем мільённыя арміі, якія па колькасьці сваёй будуць ня меншыя, як нямецка-аўстрыйскія арміі, што выступалі на нашым тэатры вайны ў 1914 годзе. З гэтага вынікае, што наш Савецкі Саюз прымушан будзе высунуць мабілізаваную Чырвоную армію, якая па колькасьці сваёй павінна быць ня меншай за арміі нашых ворагаў.

Паглядзім, якія чалавечыя рэсурсы маюць нашы заходнія суседзі?

На падставе афіцыйных статыстычных вестак асобных дзяржаў і нашых спэцыяльных падлікаў, стан чалавечых запасаў сумежных з намі краін разам узятых (Фінляндыя, Эстонія, Латвія, Літва, Польшча і Румынія) выяўляецца прыблізна ў наступным выглядзе: усяго ў гэтых краінах насяленьня 55.700.000 чал.: мужчын ва ўзросьце ад 18 да 45 год—10.000.000 чал., з іх здольных да ваеннай службы—7 млн.; навідаючы рабочых, неабходных для транспарту, прамысловасьці і г. д., мы будзем мець лічбу ў 7.200.000 чал., якія будуць мабілізаваны, што складае 13

ЖЫЦЬЦЁ І ПРАЦА АСЬВЕТНІКА.

Аб падвышэньні кваліфікацыі настаўніцтва.

Адна з чарговых задач у галіне пэдагагічнай адукацыі на 28-29 вучэбны год разгарнуць працу «Пэдтэхнікум у дому», папулярызаваць экстэрнаты за пэдфак і пэдтэхнікумы.

Яшчэ да апошняга часу сярод усяго складу вясковых настаўнікаў ёсьць шмат такіх працаўнікоў, якія ня маюць спэцыяльнае пэдагагічнае адукацыі.

Гэты кадр настаўнікаў утварыўся за часы шпаркага росту школьнае сеткі, калі нашы пэдтэхнікумы і другія пэдагагічныя ўстановы не маглі адразу даць патрэбнага ліку настаўнікаў.

Зараз нашы тэхнікумы і 2-хгадовыя пэдкурсы могуць цалкам задаволіць нашы запатрабаваньні ў настаўніках і даваць ужо замену тым, якія ня маюць спэцыяльнае пэдагагічнае падрыхтоўкі. Улічваючы тое, што некаторыя настаўнікі хоць і ня маюць спэцыяльнае пэдагагічнае адукацыі, але на працягу некалькіх гадоў, працуючы ў школах, набылі стаж і вопыт і могуць быць карыснымі працаўнікамі.

Народны Камісарыят Асьветы яшчэ ў мінулым годзе выдаў палажэньне аб экстэрнатах за пэдтэхнікум.

Гэтае палажэньне дае поўную магчымасьць тым настаўнікам, якія ня маюць належнай асьветы, а хочуць яе мець і працаваць у школах, набыць яго, здаўшы іспыты за пэдтэхнікум. Здаўшы ўсе залікі за пэдтэхнікум, настаўнік карыстаецца ўсімі правамі і прывілеямі, як і скончыўшыя пэдтэхнікумы.

Акрамя экстэрнату, паколькі цяжкавата здаваць усе прадметы адразу за пэдтэхнікум, Народны Камісарыят Асьветы ўвёў часовае мерапрыёмства для афармленьня адукацыі настаўнікаў— «Пэдтэхнікум у дому».

«Пэдтэхнікум у дому» існуе ўжо цэлы год. Пры гэтым мерапрыёмстве вясковаму настаўніку значна лягчэй афарміць сваю адукацыю за пэдтэхнікум. Вядучы працу ў школе і не адрываючыся ад яе ў вольныя хвіліны працы можна па працягу ўсяго году рыхтавацца за адзін курс пэдтэхнікуму і ў веснавы перыяд з мая і да 15 чэрвеня здаваць залікі, калі-ж на выпадак няўдачы вясною па тым ці іншым прадмеце настаўнік можа трымаць яшчэ і ў васеньнюю сэсію.

Як бачым НКА дае выхад тым настаўнікам, якія былі прыняты ў школы на працу апошніх гадоў без спэцыяльнай пэдагагічнай падрыхтоўкі і адукацыі—яе набыць і заставацца на працы.

Аб мерапрыёмствах НКА па афармленьні пэдагагічнае адукацыі павінен ведаць кожны настаўнік, які яе ня мае і пастарацца набыць, бо ў бліжэйшыя 2-3 гады Народны Камісарыят Асьветы прымушан будзе выдаць пастанову аб замене настаўнікаў без спэцыяльнай пэдагагічнай падрыхтоўкі спэцыялістамі і тады можа быць шмат нездавальненьняў і нараканьняў.

У свой час, калі старая царская школа разбуралася, а ўводзілася адзіная працоўная савецкая школа, настаўнікамі ў II канцэнтр 7-к прызначаліся з ліку скончыўшых пэдтэхнікумы, а зараз ёсьць ужо поўная магчымасьць усіх пэдтэхнікумаўцаў замяніць пэдфакаўцамі, аб чым дан загад ад НКА ў жніўні м-цы г. г. ужо ў другі раз.

Усё разам узятае выразна гаворыць аб напрамку НКА на замену працаўнікоў адпаведнай падрыхтоўкі і спэцыяльнасьці.

Усё гэта павінна быць вядома шырокім колам асьветнікаў, якія ня маюць спэцыяльнай дакумантальна афармленай пэдагагічнай падрыхтоўкі для працы ў адпаведных навучальных установах НКА.

Акруговыя інспэкцыі народнай асьветы і райінспэктары павінны своечасова паставіць да ведама ўсіх настаўнікаў і шырока папулярызаваць экстэрнаты пры пэдтэхнікумах і «Пэдтэхнікум у дому», як мерапрыёмствы па афармленьні і падвышэньні кваліфікацыі настаўніцтва.

Ан—скі.

Школы забясьпечаны падручнікамі.

На апошнім пасяджэньні прэзыдыуму цэнтральнага праўленьня саюзу працаўнікоў асьветы абгаварвалася пытаньне аб забясьпечаньні школ падручнікамі і пэдагагічнай літаратурай.

З дакладу інспэктара Наркамасьветы БССР тав. Мазура відаць, што сёлета на заданьнях НКА Белдзяржвыдавецтва па дагаворах з акруговымі інспэктарыятамі нарасьветы забясьпечвае падручнікамі і літаратураў усе культасьветныя ўстановы Беларусі. Белдзяржвыдавецтва сёлета выдала каля 20 новых падручнікаў. Апрача таго перавыдадзена некалькі кніжак старога выданьня. Дакладчык адзначыў, што падручнікамі на роднай мове будуць прыблізна раўнамерна забясьпечаны ўсе нацыянальныя культурныя ўстановы. Падручнікі і літаратура Белдзяржвыдавецтвам пачалі накіроўвацца на месцы яшчэ з чэрвеня месяца і ўсе школы імі забясьпечаны больш чым на 75 проц. У бліжэйшым часе пытаньне забясьпечаньня школ падручнікамі будзе выканана на ўсе 100 проц.

Прэзыдыум ЦП саюзу канстатаваў, што Наркамасьветы праароблена вялікая праца ў галіне забясьпечаньня школ своечасова падручнікамі.

З недахопаў адзначана: неўпарадкаваньне справы перагляду рукапісаў падручнікаў, што адбівалася на своечасовым іх выданьні, дагэтуль яшчэ існуе надзвычайная дарагавізна падручнікаў, асабліва-ж перакладных і падручнікі не па кішэні беднаце і малаапланчаемым групам рабочых і служачых. Адзначана і тое, што складаньне падручнікаў у нас праходзіць габінэтным парадкам—бяз шырокага абмену думкамі настаўніцкіх мас. Няма яшчэ цьвёрда ўстанавіўшайся арфаграфіі, што перашкаджае ў працы настаўніка.

Прэзыдыум ЦП пастанавіў перад выданьнем кожнага падручніка практыкаваць абгаварэньне пляну і прыблізнага зьместу апошняга сярод шырокіх настаўніцкіх гурткох. Вызначана таксама шэраг іншых мерапрыёмстваў для паляпшэньня справы выданьня і забясьпечаньня школ падручнікамі.

За калектыўную вытворчасьць у саюзнай працы.

У мінулыя гады нам прыходзілася досыць часта чуць нараканьні на слабы ўдзел настаўніцтва ў саюзнай і грамадзкай працы. Такія нараканьні часткова мелі падставу. Некаторыя асьветнікі сталі нібы ў баку ад саюзнай і грамадзкай працы. Гэта, бязумоўна, ненармальна, бо кожны асьветнік па самай сутнасьці сваёй павінен быць грамадзкім працаўніком. Але часам бывае і так, што саюзнымі арганізацыямі ўлічваецца толькі некаторая грамадзкая і саюзная праца, а будніпняя, штодзённая праца асьветніка сярод насельніцтва непасрэдна ня ўлічваецца. Часамі бывае і так, што мясцком адзначае адсутнасьць працы, працаўнікі з месц адзначаюць яе наяўнасьць.

У саюзнай і грамадзкай працы асьветнікаў мала плянаваньні, дагаворанасьці з масамі, узаемнай узгодненасьці, адсюль і непаразуменьні. Пляны мясцкомаў складаюцца бяз шырокага ўдзелу саюзнай масы, слаба абгаворваюцца. Радавыя саюзныя працаўнікі амаль што не прыцягваюцца да складаньня плянаў, з прычыны чаго яны аказваюцца не адпавядаючымі сілам і ўмкненьням мас, не сваімі плянамі, а прыпадненнымі зьверху.

Мала зьвяртаецца ўвагі на крытыку зьнізу, не заўсёды выпраўляліся тыя недахопы, на якія ўказвалі працаўнікі на мясцох. Адсюль падае актыўнасьць мас. На сходах выказваюцца толькі сабры праўленьняў ды абмяжованы лік «запісаных» прамоўцаў.

Саюзную і грамадзкую працу трэба зрабіць калектыўнай, масавай працай. Пляны трэба складаць, выходзячы з мясцовых запатрабаваньняў, з прыцягненьнем самай саюзнай масы. Трэба забясьпечыць магчымасьць свабоднай крытыкі саюзнымі масамі сваіх выбарных органаў і іх працы. У самай працы неабходна больш увагі зьвярнуць самаму зьместу працы, канкрэтным вынікам працы. Неабходна адмовіцца ад фармалізму і канцэлярышчыны, папяровых прапаноў і адпісаў. Больш жывой, жыцьцёвай працы, больш таварыскай дапамогі як зьверху ўніз, так і зьнізу ўверх. Заўвагі радавых працаўнікоў павінны прымацца над увагу і праводзіцца ў жыцьцё, калі яны адпавядаюць запатрабаваньням мас.

Залішняя апека зьверху досыць шкадліва і зьнішчае актыўнасьць мас, прыводзіць да бюракратызму нават у дробязях. Усюды гатовыя прапановы, гатовыя рэзалюцыі. Адчыняецца сход і зразу: «у прэзыдыум намячаюцца» ці «запрашаюцца» такія-та, далей даклад па трафарэту, сухія вельмі абмяжованыя і стрыманыя спрэчкі і гатовая рэзалюцыя. Аб самадзейнасьці, аб свабодным выказваньні тут ня можа быць і рэчы і яшчэ менш бывае наўсі на выкананьне пастановы.

Калі мы забясьпечым шырокі масавы ўдзел у складаньні плянаў, масавы кантроль над яго ажыцьцяўленьнем, калі саюзная маса будзе адчуваць сябе калектыўным творцам і кіраўніком сваёй працы, тады можна будзе чакаць жывой працы, масавага ўдзелу ў сацыялістычным будаўніцтве. Калектыўная творчасьць павінна легчы ў аснову ўсёй саюзнай і грамадзкай працы. Дырэктывы ў гэтым напрамку камуністычнай партыі неабходна ажыцьцявіць на мясцох безадкладна.

Волін.

Трэба ажывіць патрэбную справу.

На апошнім пасяджэньні прэзыдыуму ЦП саюзу працасьветы быў заслуханы даклад дырэктара Менскага белерускага пэдтэхнікуму аб працы «Пэдтэхнікуму на даму».

З дакладу высьветлілася, што ў гэтай вельмі важнай справе менскім пэдтэхнікумам амаль нічога ня зроблена. Наогул пэдтэхнікум адносіўся да гэтай справы чыста фармальна і займаўся больш папяровымі адпіскамі.

Прэзыдыум ЦП саюзу, прымаючы пад увагу, што „Пэдтэхнікум на даму" выяўляецца лепшым метадам перападрыхтоўкі настаўніцтва, пастанавіў абгаварыць гэтае пытаньне на канфэрэнцыях сяброў саюзу працасьветы. Пастаноўлена таксама прасіць Наркамасьветы выдаць дэталізаваныя праграмы і неабходныя падручнікі, якія накіраваць на месцы. Для практычнай прапрацоўкі некаторых пытаньняў праграмы „Пэдтэхнікум на даму" мяркуецца наладжваць 5-7-дзённыя нарыядычныя канфэрэнцыі асоб, якія займаюцца па гэтаму метаду.

З звайго боку цэнтральнае праўленьне пастанавіла адпусьціць магчымую суму, каб даць падручнікі ў райённыя прафсаюзныя бібліятэкі. Неабходна і Наркамасьветы з сум, адпускаемых на перападрыхтоўку настаўніцтва, выдзеліць грошы на забясьпечаньне райённых бібліятэк падручнікамі.

Прэзыдыум ЦП саюзу зьвярнуўся да ўсіх калектываў пэдагагічных тэхнікумаў БССР з просьбай дапамагаць у працы «Пэдтэхнікум да даму» ў парадку грамадзкай працы.

Вылучэньства ў саюзе працасьветы.

Згодна дырэктывам партыі і вышэйшых установаў савецкай улады ў розных саюзах і арганізацыях праводзіцца вылучэньства на адказныя савецкія і гаспадарчыя пасады. Па газэтных зьвестках і справаздачах відаць, што вылучэнцы апраўдваюць сябе.

Вылучэньства мае месца нават у Чырвонай арміі, хаця-б, здавалася, вылучэньству тут менш за ўсё месца. Тым больш вылучэньства павінна было-б практыкавацца па лініі культасьветнай, напр., пры высоўваньні кандыдатаў у загадчыкі школ, райённыя інспэктары і інш. А між тым да гэтага часу назіраюцца факты, калі на гэтыя пасады высоўваюцца ў адміністрацыйным парадку і прызначаюцца асобы, зусім не аўтарытэтныя сярод настаўніцтва, з якім прыдзецца працаваць, і ня маючыя належнай падрыхтоўкі. Прызначаюцца часамі людзі, зусім невядомыя на практычнай працы, са школьнай лаўкі. І зразумела, цэлы шэраг непаразуменьняў. А саюзныя органы працасьветы сваіх працаўнікоў ня ведаюць і ня вынучаюць і ўдзелу ў культурным будаўніцтве прымаюць вельмі мала.

Такое зьявішча трэба лічыць ненармальным. Саюзныя арганізацыі павінны вывучаць працу членаў свайго саюзу і найлепшых працаўнікоў высоўваць на больш адказную працу. Трэба больш прыцягваць масу да гаспадарчага і культурнага будаўніцтва, высоўваць лепшых і аўтарытэтных таварышоў на працу. Ад бюракратычных форм трэба патрохі адыходзіць. Тады будзе больш чуласьці ў нашым савецкім апараце, будзе праяўляцца больш ініцыятывы, грамадзкасьці. А зараз у нас стараюцца больш дагадзіць таму, ад каго залежыць тая ці іншая асоба.

У нашым саюзе прынята больш націскаць на радавых працаўнікоў, а мала практыкуюцца метады грамадзкай адзінкі карыснай працы паасобных таварышоў менш, чым у іншых саюзах. Часамі дзесяткамі гадоў працуе ў глухой вёсцы асьветнік, змагаецца з цемрай, і ніхто не падтрымае яго ў цяжкай працы. Трэба лепшыя прыклады даваць ня толькі ў літаратурных творах, але і ў самым жыцьці, трэба выяўляць і паказваць жывых людзей, будаўнікоў новага жыцьця. В. С.

Наша перапіска.

Воку—ваш артыкул „Цікавая метамарфоза" друкавацца ня будзе—нельга звальняць настаўнікаў толькі таму, што яны зьяўляюцца раднёй панам, магчыма гэта непрашкаджае ім быць добрымі настаўнікамі, аб чым вы якраз нічога ня пішаце.

Артыкул-жа ваш „Папы настаўнікі" накіроўваецца Бабруйскаму ўпаўнаважанаму ЦКК РСІ.

Настаўніку Н. М.—ваш допіс „Патрэбная рэформа" ня пойдзе—па нашаму ваша рэформа якраз непатрэбна.

Трэба вывучыць справу разьвядзеньня тытуню.

У сувязі з заметкай «Шаўкоўніцтва ў БССР—рэальная справа», зьмешчанай у № 199 газэты «Савецкая Беларусь», паведамляю наступнае.

У архіве Беларускай Сельска-Гаспадарчай Акадэміі маюцца весткі аб добрых выніках культуры тутавага дзерава і разьвядзеньня шаўкавічнай вусені, якія мелі месца ў былым Горацкім Земляробчым Інстытуце ў перыяд часу 1848-54 г. г. У Акадэміі да гэтага часу захаваліся ўзоры шаўкавічных коканаў, якія меліся тады, маецца таксама шоўкаматальны варстат, адпаведны апісаньню яго ў Энцыклёпэдыі-слоўніку Брокгауза і Эфрона т. 39.

Культура тутавага дзерава, якая дала зусім добрыя вынікі ў Горках, у той час, аднак, за межы Горацкага райёну не распаўсюдзілася.

Гэтага нельга сказаць пра другую расьліну, якая можа мець ня меншае значэньне для інтэнсіфікацыі сельскай гаспадаркі БССР, а іменна пра тытунь; гэта расьліна дасканала разьвіваецца ня толькі ва ўмовах суседняй з намі УССР, але і ў умовах БССР. У часы Горацкага Земляробчага Інстытуту культура тытуню, выпрабаваная спачатку ў Інстытуце, атрымала потым досыць шырокае распаўсюджаньне і за межы Горацкага райёну, што можна ўбачыць, напрыклад, з афіцыйнай справаздачы аб Горацкай сельска-гаспадарчай выстаўцы 1853 году,—на гэтай выстаўцы сярод іншых экспанатаў сельскай гаспадаркі, дэманстраваліся ўзоры тытуню і тытунёвых вырабаў, атрыманыя ня толькі на Навуковай Фэрме Інстытуту (турэцкі тытунь), але і ў маёнтку аднаго абшарніка Магілеўскай губ., Копыльскага павету (амэрыканскі тытунь), а таксама ў адным маёнтку Смаленскай губ. Рослаўльскага павету (гаванскі тытунь). Незалежна ад тытунёвых экспанатаў Навуковай Фэрмы, Батанічны сад Інстытуту выставіў тады 15 відаў цыгар, выробленых з розных гатункаў разьведзенага ў ім тытуню. Склаўшыя справаздачу — прафэсары Цэлінскі і Рэго гаворыць, што дабраякаснасьць выстаўленых тытунёвых вырабаў «сьведчыць аб магчымасьці разьвядзеньня тытуню ў тутэйшым краі». (Запіскі Горацкага Земляробчага Інстытуту, кн. III, стар. 157). Нажаль, надышоўшыя затым гады рэакцыі і зачыненьне Інстытуту, перашкодзілі яму замацавацца ў жыцьці дасягнутыя посьпехі ў галіне разьвядзеньня тытуню. Аднак, калі прыняць пад увагу, што пададзены вывад складзен на падставе праверэных назіраньняў, якія рабіліся ў працягу некалькіх гадоў і зроблен такімі паважнымі і асьцярожнымі працаўнікамі, як аўтары справаздачы, то практычнае значэньне яго для сельгаспадаркі БССР наўрад ці можа выклікаць сумненьне. Гэра пацьвярджае і прыклад Украіны, дзе разьвядзеньне тытуню займае значную частку сельскагаспадарчага прыбытку, гэта пацьвярджаюць і весткі батанічнага саду сельска-гаспадарчай Акадэміі, дзе здаўніх часоў і да гэтага моманту з посьпехам культывуюцца некалькі гатункаў тытуню (амэрыканскі, арґентынскі і інш.), адзін з гэтых гатункаў і скырыстоўваецца для паленьня прафэсарам, загадчыкам саду.

Трэба думаць, што культура шаўкавіцы і тытуню сапраўды можа мець вялікае значэньне для інтэнсіфікацыі сельскай гаспадаркі БССР (адна дзесяціна тытуню можа даць каля 600—700 руб. чыстага прыбытку), але для таго, каб пытаньне аб гэтых культурах можна было паставіць на рэальную глебу, неабходна выпрабаваць іх раней у сельскай гаспадарцы з дакладным улічэньнем усіх фактараў вытворчасьці, г. зн. фактараў і натуральна-гістарычных і эканамічных.

Вось чаму, як ні цікавы нагляданьні, паведамленыя ў заметцы аб шаўкаўніцы, яны вельмі недастаковы. Гэтыя нагляданьні неабходна паставіць на вопытных сельска-гаспадарчых станоўішчах БССР. Нажаль, нават Горацкая сельска-гаспадарчая вопытная Станцыя, якая павінна працягваць работы, пачатыя ў свой час вопытным полем Горацкага Земляробчага Інстытуту, нават гэта станцыя, наколькі нам вядома, не вывучае памянёнай культуры.

У сучасны момант практычна важным пытаньнем зьяўляецца пытаньне, якім спосабам увесьці ў праграму вопытных станцый вывучэньне культур памянёных расьлін. Гэта пытаньне і пажадана было-б абмеркаваць у друку.

Н. Пелехаў.

Будні Мазырскага цагельнага заводу.

На адлегласьці паўтары—дзьве вярсты ад гораду знаходзіцца цагельны завод камунтрэсту. Да рэвалюцыі завод належаў пану Кіркевічу. Будуючы завод, ён ня лічыў колькасьці сыравіны, якая маецца вакол заводу. Прапрацаваў ён некалькі год. У 1925 г. завод перайшоў у веданьне камгасу; не хапала частак, і завод стаяў і ў 1925 годзе. У 1926 годзе завод пачаў працаваць, якасьць выраблянай цэглы добрая, але ўсё-ж вытворчая праграма ня выконвалася з-за адсутнасьці патрэбнай колькасьці сыравіны. У 1927 годзе вытворчая праграма выканана на 60-70 проц.

Урэшце, 1928 год, і тут праграма зноў ні ў якім разе ня будзе выканана, і вось па якой прычыне: сёзон працы цагельнага заводу да верасьня месяца, а ён гэтымі днямі спыніць сваю працу, калі ня будзе сыравіны. Каго-ж вінаваціць у гэтым? Ні адміністрацыю, ні завком нельга вінаваціць, бо яны рапей гэта прадбачылі і ставілі пытаньне аб пераводзе заводу ў іншае месца, але адказу пакуль не атрымалі.

Мне даводзілася хадзіць цэлы дзень па заводзе, гаварыць з рабочымі, адміністрацыяй, але яны не вінаваты. У старой кар'еры (адкуль дастаўляюць гліну) маецца вялікі запас яе, але падыйсьці да гэтай кар'еры вельмі небясьпечна,—могуць быць няшчасныя выпадкі, абвалы. Рабочыя выяўляюць ініцыятыву, каб знайсьці гліну. Вось, напрыклад, рабочы Шчарбіна (старшыня вытворчай камісіі) усе свае сілы аддае на тое, каб знайсьці гліну. Знайшоў месца, прасьвідраваў на два сажні, гліна ёсьць, а дастаць яе цяжка—вада заліває.

Полудзень. Гудок. Рабочыя (іх 46 чал.) зьбіраюцца ў сталоўку. Прайшло паўгадзіны, напалуднавалі. Старшыня завкому абавяшчае, што зараз будзе чытка. Рабочыя сядаюць за стол. Чытаюць аб экспедыцыі Нобіле, але рантам адзін з рабочых гаворыць:—А што мне дае газэта... (а іх выпісваюць 35 экз.), калі гэтымі дняі я пайду зноў на біржу, давай лепш паговорым, дзе дастаць гліну, і што нам рабіць.

Так спрачаліся, пакуль не загудзеў гудок. Зноў рухавік пыхае, шасьцёркі крычаць, ваганеткі падаюць гліну і на тачках адвозяць гатовую цэглу.

А пасьля працы зноў абгаварваюць пытаньне аб цэгле, аб працы, і так цэлы дзень рабочыя гавораць усё аб адным. У мінулым годзе горад адчуваў вялікі недахоп цэглы, уся цэгла была загадзя прадана, а каапэрацыйнае і камунальнае будаўніцтва павінна было купляць у прыватнікаў і пераплачваць па 10 руб. на тысячы.

У гэтым годзе камунтрэст дае цэглу камгасу, а каапэрацыйныя арганізацыі (Жакты) павінны купляць у прыватнікаў, а ў будучым годзе, мабыць, і камгасу прыдзецца купляць у прыватнікаў, а ў іх якасьць нядобрая і даражэй на 25 проц. Вось чаму мы зараз павінны паклапаціцца аб пабудове цагельнага заводу.

Яўхім.

Новыя працкалектывы.

Віцебск, 10-9. У 1928-29 апэрацыйным годзе кіраўніцтвам працкалектывамі намечаны да арганізацыі: працкалектыў панчошнай фабрыкі на 300 рабочых, працкалектыў абутковай вытворчасьці на 70 рабочых, вытворчасьці дзіцячага абутку—20 рабочых, гарбарня на 30 рабочых і працкалектыў па вырабу матрацаў на 30 чал. Усяго мяркуецца адчыніць 5 новых працкалектываў з агульным лікам рабочых у 450 чал.

З ліку існуючых працкалектываў кіраўніцтва мяркуе пашырыць працкалектыў па збору рызьля на 300 рабочых, металёўдаў—70 рабочых, хімікаў—40 чал., па вырабу люстэрак—70 чал., шорнікаў—25 чал., па вырабу лямцу—20 чал., загатоўшчыкаў—7 чал., бляхароў—15 чал., бэтоншчыкаў—40 чал. і «Трудторг» на 30 чал. Усяго працкалектывамі будзе ахоплена 617 новых рабочых. На пашырэньне і арганізацыю новых працкалектываў патрабуецца 275250 р.

ЗА ДАЛЕЙШАЕ ЎЗМАЦНЕНЬНЕ ЭКСПАРТУ.

Нядаўна агалошан абежнік Савету Працы і Абароны і толькі што разасланы Наркамгандлем БССР усім загатоўцам аб ролі дзяржаўных і каапэрацыйных арганізацый, а таксама прыватных асоб у загатоўцы экспартных тавараў другараднага значэньня—яшчэ раз са ўсёй рашучасьцю і настойлівасьцю падкрэсьлівае ўсю важнасьць і сур'ёзнасьць экспарту другараднага відаў тавараў. Трэба сказаць, што, на гледзячы на ўжытыя меры да павялічэньня новых відаў экспарту, да гэтага часу гэта праца яшчэ ня вельмі шырока разгорнута, яшчэ ня ўсе райёны ахоплены загатоўчай дзейнасьцю. Пагоня за першараднымі таварамі, імкненьне загатаўляць, галоўным чынам, тавары першараднай важнасьці засланіе, нажаль, ініцыятыву загатоўкі дробных, новых відаў тавараў.

У 1927-28 годзе беларускі асноўны экспартэр—Белдзяржгандаль разьвіў вялікую працу па загатоўцы другараднага відаў, павялічыў сваю намякатуру да 50-ці назваў, але гэтага мала. Яшчэ маюцца цэлыя райёны, якія застаюцца ня вывучанымі, цэлыя райёны, неахопленыя загатоўкамі, і на гэтыя зьявішчы зварочвае ўвагу вышэй азначаны абежнік.

Каапэрацыя да гэтага часу не раскачалася, як след, у адносіне выяўленьня новых відаў экспарту. Мала таго, каапэрацыя часта варожа адносілася да экспартных заданьняў. А таму дырэктыва вышэйшага рэгулюючага органу—Савету Працы і Абароны—павінна значна і востра зьмяніць адносіны каапэрацыі да экспартных заданьняў па БССР.

Трэба прызнаць, што вельмі перашкаджае разьвіцьцю экспарту другараднага значэньня слабое і несваечасовае фінансаваньне экспартуючых арганізацый, што значна адбілася на ходзе загатоўчай працы.

Далейшае разьвіцьцё і ўзмацненьне экспарту павінна быць праведзена найбольш інтэнсыўным і ўзмоцненым тэмпам, для чаго ў гэтым абежніку мяркуецца важны момант: «у тых пунктах, дзе дзяржаўныя і каапэрацыйныя арганізацыі ня могуць ахапіць рынку ўласным апаратам, прапанаваць апошнім выкарыстаць прыватных асоб і арганізацыі ў загатоўцы другараднага відаў экспарту, шляхам утварэньня камісійных і іншых дагавораў".

Гэты спосаб, бязумоўна, дасьць магчымасьць глыбей ахапіць найбольш глухія райёны БССР.

Усе вышэйазначаныя мерапрыёмствы зьяўляцца надзвычайна важнымі, але галоўнае, каб нашы каапэрацыйныя і дзяржаўныя загатоўцы ўявілі сабе ўсю неабходнасьць узмацніць экспарт другараднага тавараў, адмовіліся ад канкурэнцыі паміж сабой, дапамагалі адзін другому і агульнымі сіламі імкнуліся да поўнага ахопу рынку усёй БССР, каб у 1928-29 г. даць максымальную колькасьць экспарту другараднага значэньня.

Леўскі.

ХЛЕСТАКОЎ, ЯКІХ ЯШЧЭ НЯ БЫВАЛА.

Вайна. Голад. Разруха. А разам з тым усё, што толькі можа рухацца, пускаецца ў ход. Усё рухалася, пакуль ішло,—стала—кончана. Няма каму рамантаваць. Для чалавечага арганізму не хапала хлеба, і чалавек нэрвамі і воляй натужваў сілы і ішоў да апошняга выдаху... Машына, тэхніка зусім іншая, яна не адчувае... Што ёй клясавы інстынкт, будучына і г. д. Дай ёй сырцу нафты, вугалю, інжынэра і ўсё, А вугалю, нафты за фунт—фунт золата... Застой. А некаторыя спэцы—інжынэры былі заграніцай і на важнымі паштоўнасьці на баль-маскарадах у насьцюмах «зьвярыных бальшавікоў» танцавалі модны для таго цывілізаванага часу „Танец Смерти". Чужаземная буржуазея ў экстазе поўным быццлячай радасьці—вітала воплескамі навінку сэзону.

Апэтыт ненасытнай тыгрыцы разгараўся з возьмярымай сілай: як-жа, перад вачыма... праўда хоць на сцэне... чорная сьмерць у кароне з двухгаловым арлом давіць чалавека ў шэрай вопратцы і будзённаўцы... На труп узьлятае белая фэя... ізноў-такі ў кароне... і разам са сьмерцю танцуе заключны акорд... Публіка воплескала, чуючы кроў. Эмігранты ў экстазе:—Ура! Перамаглі!..

А на савецкай зямлі фронт танцаваў свой танец, заключны акорд якога ўліваў у змучаны, галодны і халодны арганізм рабочых і сялян гарачыя сокі веры і надзеі. З неймавернай сілай рашчымляліся цэпкія лапы бандырыны сьмерці.

І вось, у такі час, уявеце сабе, у такой вайсковай установы ўваходзіць чалавек. Ветліва павітаўся і яшчэ ветлівей прапануе вам свае паслугі:—

... Ён інжынэр!..

Ён член РКП!..

На руках партбілет!..

Стаж з 1917 году!..

О, радасьць! Паколькі патрэбен такі чалавек... Разруха... Недахоп тэхнічных сіл.. І тут вось ён, як з неба зваліўся. Ён, Круковіч Пётр Пятровіч, з партбілетам—інжынэр...

Пашло назначэньне за назначэньнем. Чалавек патрэбны. Учерш назначылі на пасаду ваенкома Дагестанскай абласной ваенна-інжынэрнай дыстанцыі, а потым—ваенкома Тэрскай абласной ваенна-інжынэрнай дыстанцыі, ваенкомам Растоў н-Д ваенна-інжынэрнай дыстанцыі, ваенкомам 3-га дывізіёну ваенна-палявога будаўніцтва і г. д. і г. д. і г. д. Ня ведаем добра, што ён там рабіў, але факт той, што не спадабалася Пятру Пятровічу Круковічу гэта праца. Пераходзіць Круковіч на працу на галіне Крымвышуку. У 1920 годзе ён—памоцнік начальніка Крымвышуку Дагестанскай рэспублікі. Відзе барацьбу... са злачынным элемэнтам..

Чыстка партыі ў 1921 годзе прымушае яго пакінуць гэтую працу. Вычысьцілі. Абвінавачвалі ў цэлым шэрагу злачынстваў, у тым ліку і ў зносінах са злачынным сьветам. Але Круковіч духам ня падае і часу ня траціць. Прыяжджае ў Харкаў і, маючы на руках цэлы пук дакумантаў, у тым ліку і дакументы аб партыйнасьці,—прымайстроўваецца ў кіраўніцтва Нач. Інж. Украіны і Крыму, дзе, атрымаўшы мільён рублёў, зьмыўся...

Будучы чалавекам нядурным і ўяўляючы сабе, што ён ужо—ня ён і жыць яму, як Круковічу, цяжкавата будзе, ён накіроўваецца ў Петраград. Там карыстаецца старым сродкам. Купляе новыя дакументы, у тым ліку і партбілет з адзнакамі, што прайшоў „чыстку"... і Круковіча няма, а ёсьць новы чалавек з новым прозьвішчам, з новымі дакумантамі.

У «інжынэра» разам з іншымі дакумантамі маецца пасьведчаньне, што ён студэнт другога курсу інстытуту грамадзянскіх інжынэраў. Карыстаючыся ім «інжынэр» паступае на пасаду таксатара ў «Северолес». А так як «інжынэр» чалавек з шырокай натурай і в добрым нюхам, дык ён, пашчупаўшы новае „дело", рашыў, што тут «ні салам, ні маслам» не пажывішся. Прыгнуў кот цераз плот і няма...

І паехаў наш коцік „гражданскі і вайсковы інжынэр" у горад Омск. Горад думае далёкі, але паўны...

А ў гэты час зусім закончылася вайна. Бот і лапаць прыдушылі чорную драпежную балярыну—сьмерць... Толькі брат яе голад шалыгаў на некаторых частках савецкай зямлі і біноклям вялікіх, выпуклых з абцянутае скуры касьцяка—вот выбіраў сабе дабычу... І ня ўзіраючыся на стогн хворых са сьціснутымі зубамі—аднакай вялікага і трагічнага спакою, удзельнікі нядаўнай крывавай драмы сталі рабочымі ў сваіх варштатаў. Заступацелі машыны і гудком фабрычных каміноў, жыцьцё сыгналізавала абудженьне таго, што часова замерла..

У такую пору „інжынэр" узяўся за выкананьне абавязкаў «производителя работ» у сібірскай краявой ваенна - інжынэрнай дыстанцыі ў г. Омску. Праз нейкі час абурэньне рабочых зьдзекам некваліфікаванага кіраўніка, а потым вялікая грашовая растрата і—«інжынэра» няма...

Харкаў. ЦК КП(б) Украіны. Габінэт кіраўніцтва справ ЦК. За сталом кіраўнік—наш стары знаёмы.

Мучаць яго думкі аб грошах. Нэрвы магчымасьць няпрыемнага спатканьня... І просіць ён перавесьці яго на «скромную» пасаду загадчыка дачным аддзелам Харкаўскага Выканкому. Перавялі. Там раскашэльвае больш 4000 р. дзяржаўных грошай не якіх-небудзь «совзнакаў», а самых новеньких чырвончыкаў... А чырвончыкі толькі яшчэ ў сьвет выйшлі і гэтакія новыя... ліпкія... вось так проста і да рук і ліпнуць, што не адарвеш. Узяў іх «інжынэр» і айда ў дарогу... А ў дарозе чырвончыкі прынадабяцца, тым болей, што ехаць аж да самага Пскова. А горад Пскоў звычаі старыны «блюдёт»... Сустрэў гасьця з хлебам сольлю ды і пажалуйце на пачэснае мейсца прараба Пскоўскага Губвіду па Таранецкаму райёну. Тут ізноў «деньга» узьлюбіла нашага «інжынэра». Узяў гэта ён яе, ды ня тое, што ўзяў, а проста абхапіў, як называецца і павёз у Растоў н-Дану...

Прыехаў туды, як на бацькаўшчыну. Вядомая рэч, тут на ногі ўставаў, жыць вучыцца пачынаў. Памятае ня толькі ваенна-інжынэрную дыстанцыю, а кожны куток і кожную... а, ды што гаварыць—усё адным словам... Праўда, яго не пазналі, бо ён—то ён, а паперы былі другія.

Але як бы там ні было, пасаду далі, ды яшчэ якую, сымбалічную! Назначылі яго ў Паўночна-Каўкаскую краёвую камісію дапамогі зьняволеным і пасьпеў гэты чалавек запакаваць у кішэнь чутачку больш 5000 руб., як узялі ды і самога зьняволілі. Аддзякавалі за дапамогу. Праўда, пакуль што за омскія справы. Але не здарма ён інжынэр—усякую тэхніку ведае. Павялі гэта яго ў камісію справы поваму начальству здаваць, а ён ногі на перад, тох у рухавік і бывайце здаровы. Раставічане—лаві!.. дзяржы!.. крычаць. Але дзе-ж там птушку ў паветры зловіш!..

І паляцела гэта яна ў Ленінград. Убачыўшы, што далёка адляцела, села на зямлю «клюнуць» што-небудзь. Клюнула. З шляхоўкай (путевкой) ПУРа войск едзе інжынэр ужо пад новым прозьвішчам Старшэўскага Адама Канстанцінавіча. З новым прозьвішчам і з новым партбілетам. З новым партбілетам і з новым напрамкам... Усюды думае бываў, магу быць географам ня горшым чым які-небудзь прафэсар якога-небудзь універсытэту, а ў Беларусі ня бываў,—„безобразие"!..

І паехаў...

І прыехаўшы ў Віцебск, пайшоў у Акругком КП(б)Б, папюхаў, няма чаго клюнуць. Рашаецца зьмяніць палёт у напрамку на сталіцу. А яму віцебляне і шляховачку ў рукі (усё адно, як адчувалі бедныя біду)—«пажалуйце, гаворыць, у Менск, вы, як відаць, «крупный роботник», вас там і скарыстаюць больш мэтазгодна...

І скарысталі. Даверчывыя працаўнікі ЦК КП(б)Б ізноў-такі шляховачку інжынэру ў руку і ў Мазыр на адказную працу.

Ну, думае інжынэр, прапаў я. Сам Мазыр з усімі там разам пятак варт, што я буду рабіць. «Мелочь пошла, а не «дзялы»!

Сеў у вагон, разьмясьціўся... Аглядзеўся. Адно бачыць, уваходзіць у яго купэ дзядзька нейкі з партфэлем. Сеў папяросу выймае, закурыць хоча, па кішэнях шарыць... А інжынэр чах і запалачку пад нос—пажалуйце!..

— Вы куды?

— У Мазыр.

— А вы?

— Таксама.

— Вось гэта «превасходна»—з радасьцю прагазарыў інжынэр.

Значыць вы і Мазыр добра ведаеце. Праўда, што гэта вёска ды і толькі. І ці праўда, што там гэтыя малярыйныя камары кусьюцца?

— Ня вёска, а самы сапраўдны акруговы горад з вялік

ЗАКОНЫ І ЗАГАДЫ УРАДУ БССР.

Пастанова
Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР

аб аслабаненьні тав. Сташэўскага, Алеся Язэпавіча, ад абавязкаў Народнага Камісара Ўнутраных Спраў БССР і аб назначэньні яго Народным Камісарам Юстыцыі БССР.

Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР пастанаўляе:
1. Аслабаніць тав. Сташэўскага, Алеся Язэпавіча ад абавязкаў Народнага Камісара Ўнутраных спраў БССР.
2. Назначыць тав. Сташэўскага, Алеся Язэпавіча, Народным Камісарам Юстыцыі БССР.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Чарвякоў.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Хацкевіч.

1 верасьня, 1928 г.
г. Менск.

Постановление
Президиума Центрального Исполнительного Комитета БССР

об освобождении тов. Сташевского, Александра Осиповича от обязанностей Народного Комиссара Внутренних Дел БССР и о назначении его Народным Комиссаром Юстиции БССР.

Президиум Центрального Исполнительного Комитета БССР постановляет:
1. Освободить тов. Сташевского, Александра Осиповича от обязанностей Народного Комиссара Внутренних Дел БССР.
2. Назначить тов. Сташевского, Александра Осиповича, Народным Комиссаром Юстиции БССР.

Председатель Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Червяков.

Секретарь Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Хацкевич.

1 сентября, 1928 г.
г. Минск.

Пастанова
Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР

аб аслабаненьні тав. Браўковіча Т. А. ад абавязкаў сталага прадстаўніка БССР пры ўрадзе Саюзу ССР.

Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларускае ССР пастанаўляе:
Аслабаніць тав. Браўковіча, Тадэвуша Аляксеевіча ад абавязкаў Сталага Прадстаўніка Беларускае ССР пры ўрадзе Саюзу ССР.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Чарвякоў.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А Хацкевіч.

8 верасьня, 1928 г
г. Менск.

Постановление
Президиума Центрального Исполнительного Комитета БССР

об освобождении тов. Бровковича Ф. А. от обязанностей постоянного представителя БССР при правительстве Союза ССР.

Президиум Центрального Исполнительного Комитета Белорусской ССР постановляет:
Освободить тов. Бровковича, Фадзея Алексеевича от обязанностей постоянного представителя Белорусской ССР при правительстве Союза ССР.

Председатель Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Червяков.

Секретарь Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Хацкевич.

8 сентября, 1928 г.
г. Минск.

Пастанова
Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларускае ССР

аб аслабаненьні тав. Каровікава, Цімоха Юркавіча ад абавязкаў намесьніка Народнага Камісара Земляробства БССР.

Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР пастанаўляе:
Аслабаніць тав. Каровікава, Цімоха Юркавіча ад абавязкаў Намесьніка Народнага Камісара Земляробства БССР.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Чарвякоў.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Хацкевіч.

1 верасьня, 1928 г.
г. Менск.

Постановление
Президиума Центрального Исполнительного Комитета Белорусской ССР

об освобождении тов. Коровикова, Тимофея Георгиевича от обязанностей заместителя Народного Комиссара Земледелия БССР.

Президиум Центрального Исполнительного Комитета БССР постановляет:
Освободить тов. Коровикова, Тимофея Георгиевича от обязанностей Заместителя Народного Комиссара Земледелия БССР.

Председатель Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Червяков.

Секретарь Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Хацкевич.

1 сентября, 1928 г.
г. Минск.

Пастанова
Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларускае ССР

аб назначэньні тав. Паўлюкевіча А. І. сталым прадстаўніком БССР пры ўрадзе Саюзу ССР.

Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР пастанаўляе:
Назначыць тав. Паўлюкевіча, Аляксандра Іванавіча Сталым Прадстаўніком Беларускае ССР пры Ўрадзе Саюзу ССР.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Чарвякоў.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Хацкевіч.

8 верасьня, 1928 г. г. Менск.

Постановление
Президиума Центрального Исполнительного Комитета Белорусской ССР

о назначении тов. Павлюкевича А. И. постоянным представителем БССР при правительстве Союза ССР.

Президиум Центрального Исполнительного Комитета БССР постановляет:
Назначить тов. Павлюкевича, Александра Ивановича постоянным представителем Белорусской ССР при Правительстве Союза ССР.

Председатель Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Червяков.
Секретарь Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Хацкевич.

8 сентября, 1928 г. г. Менск.

Пастанова
Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларускае ССР

аб назначэньні тав. Сасноўскага, Антона Міхайлавіча і Стракоўскага, Уладзіміра Канстанцінавіча Намесьнікамі Старшыні Вышэйшага Савету Народнае Гаспадаркі БССР.

Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР пастанаўляе:
Назначыць т. т. Сасноўскага, Антона Міхайлавіча і Стракоўскага, Уладзіміра Канстанцінавіча Намесьнікамі Старшыні Вышэйшага Савету Народнае Гаспадаркі БССР.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Чарвякоў.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Хацкевіч.

1 верасьня, 1928 г.
г. Менск.

Постановление
Президиума Центрального Исполнительного Комитета Белорусской ССР

о назначении т. т. Сосновского, Антона Михайловича и Страковского, Владимира Константиновича Заместителями Председателя Высшего Совета Народного Хозяйства БССР.

Президиум Центрального Исполнительного Комитета БССР постановляет:
Назначить т. т. Сосновского, Антона Михайловича и Страковского, Владимира Константиновича Заместителями Председателя Высшего Совета Народного Хозяйства БССР.

Председатель Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Червяков.
Секретарь Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Хацкевич.

1 сентября, 1928 г.
г. Минск.

Пастанова
Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларускае ССР

аб аслабаненьні тав. Міленькага, Марка Ільліча ад абавязкаў намесьніка старшыні Вышэйшага Савету Народнае Гаспадаркі БССР.

Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР пастанаўляе:
Тав. Міленькага, Марка Ільліча, з прычыны ўваходу яго на вучобу, аслабаніць, згодна яго асабістай просьбы, ад абавязкаў намесьніка Старшыні Вышэйшага Савету Народнае Гаспадаркі БССР.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Чарвякоў.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Хацкевіч.

10-га верасьня, 1928 г.
г. Менск.

Постановление
Президиума Центрального Исполнительного Комитета Белорусской ССР

об освобождении тов. Миленького, Марка Ильича от обязанностей заместителя председателя Высшего Совета Народного Хозяйства БССР.

Президиум Центрального Исполнительного Комитета БССР постановляет:
Тов. Миленького, Марка Ильича, в связи с уходом его на учебу, освободить, согласно его личной просьбы, от обязанностей заместителя Председателя Высшего Совета Народного Хозяйства БССР.

Председатель Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Червяков.
Секретарь Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Хацкевич.

10-го сентября, 1928 г.
г. Минск.

ХРОНІКА.

ШТО ВЫЯВІЛА ЎСЕБЕЛАРУСКАЯ НАРАДА ПА ДАРОЖНАЙ СПРАВЕ.

Гэтымі днямі закончыла сваю працу ўсебеларуская нарада па дарожнай справе, скліканая «Аўтадорам» БССР.

Нарада абмеркавала цэлы шэраг пытаньняў арганізацыйнага і тэхнічнага характару. Былі заслуханы даклады акруговых аддзелаў „Аўтадору" і зроблен агляд дарожнай гаспадаркі ў БССР.

Т-ва «Аўтадор» мае ўжо значныя вынікі ў сваёй працы. Ва ўсіх акругах БССР зараз налічваецца 183 ячэйкі, якія яднаюць каля 8000 сяброў. Практычная праца «Аўтадору» праводзіцца ў цэлым шэрагу акругаў.

У Бабруйску акруговае аддзяленьне арганізавала ўпяршыню аўтабусны рух. Аддзяленьне мае 1 аўтабус для рэйсаў, 1 аўтамабіль і 1 матацыкл для вучэбных мэтаў.

Аддзяленьне арганізавала курсы па «Аўтадору» на 40 чалавек для сяброў сваіх ячэек. Апроч гэтага пры гарнізоне ь. ліквідаваны курсы на 80 дамабілізаваных чырвонаармейцаў. Гэтыя курсы маюць на ўвазе падрыхтаваць актывістаў па дарожнай справе ў вёсцы.

Менскае аддзяленьне яднае 62 ячэйкі з 2000 сябрамі. 5 ячэек маюць уласныя аўтамабілі, 10 ячэек маюць гурткі па аўтамабільнай справе. Аддзяленьне выяжджала ў в. Галіцы, дзе была напраўлена вуліца, што агулам каштавала каля 4000 руб. Апроч гэтага, былі пабудаваны 4 масты.

У Менску аддзяленьне арганізуе курсы дарожных майстроў для Менскай і Бабруйскай округ. Апроч гэтага, будуць арганізаваны платныя аўтакурсы для членаў „Аўтадору".

Таксама добра працуе Віцебскае аддзяленьне, якое арганізавала курсы дарожных майстроў. 39 майстроў ужо выпушчаны на практычную працу.

Мазырскае і Магілеўскае аддзяленьні пазначна разгарнулі сваю працу; вусім нязмыцьцёвымі зьяўляюцца аддзяленьні Полацку і Воршы.

Як вялікую хібу ў працы «Аўтадору», нарада высунула слабы ўдзел у гэтай справе прафсаюзных арганізацый. У Менску, Магілеве і інш. гарадох саюзы не даюць нават указаньняў сваім нізавым арганізацыям аб удзеле ў працах «Аўтадору».

Старшыня праўленьня Беларускага Аўтадору т. Сташэўскі адзначыў у сваёй прамове, што перад т-вам „Аўтадор" стаіць неадкладная задача па ўцягненьні ў шэрагі яго шырокіх колаў працоўных гораду і вёскі.

— У большай частцы нашых вёсак,— адзначыў т. Сташэўскі,— ня толькі праехаць, але і прайсьці нельга. Адзначасна з паляпшэньнем шляхоў трэба распачаць прасоўваньне ў вёску аўта-машыны, бо гэта вымагае ад нас і наша сельская гаспадарка, і каапэрацыя, і мэдыцына, і газэты.

Менскі дзень.

— На 712.000 руб. скураных тавараў назначыла заявезьці праўленьне Скурсындыкату ў верасьні м-цы ў БССР. Апрача гэтага будзе завезена скуранога абутку на 150.000 руб.

— 50.000 штук бітай птушкі пастанавіў загатовіць Нар. Кам. Гандлю па БССР. З гэтай колькасьці Белдзяржгандаль мае загатовіць—30.000 штук і Белсельсаюз—20.000 шт.

— 40.000 р. адпускае цэнтральнае праўленьне саюзу Савгандслужачых на пабудову саду-стадыёну для сяброў прафсаюзу.

Грамадзкі прагляд карцін з жыцьця працоўных БССР.

15-га верасьня адбудзецца грамадзкі прагляд 10 мастацкіх карцін, напісаных з жыцьця працоўных БССР, якія былі заказаны Беларускім Дзяржаўным Музэем беларускім мастаком т. т. Бразеру, Грубэ, Філіповічу, Кругеру і інш. З усіх карцін 7 напісаны на беларускія тэмы і 3—на яўрэйскія.

Завочныя курсы эспэранто.

Беларускі камітэт саюзу эспэрантыстаў арганізуе з 1-га кастрычніка завочныя курсы па вывучэньню мовы эспэранто. Курсы будуць вясьціся шляхам перасылкі на поўнае лекцый на эспэранто. Тэрмін навучаньня на курсох—5 месяцаў. Плата за навучаньне ўстаноўлена ў суме 8 руб.; рабочым, бяднейшым сялянам і сябрам саюзу эспэрантыстаў скідка 20 проц.

Замежны друк аб БССР.

У Баўгарскай літаратурнай часопісі «Накавальня» зьмешчан вялікі артыкул на тэму: „Культура Савецкай Беларусі".

У англійскім журнале зьмешчан артыкул аб становішчы беларусаў у Польшчы.

Як праходзяць хлебазагатоўкі.

Сёлета па БССР хлебазагатоўкі распачаліся ў канцы жніўня. Першы падвоз хлебапродуктаў быў у Слуцкім і Быхаўскім раёнах. Трэба адзначыць слабы тэмп хлебазагатовак Белсельсаюзу.

Так, на вестках Нар. Кам. Гандлю БССР за 20 дзён жніўня Белкапсаюзам загатоўлена 244 тоны, за гэты-ж самы час Белсельсаюзам пры роўнай цэны і пры дастатковым забясьпечаньні фінансамі загатоўлена толькі 29 тон.

Адчыніўся сэзон вандроўнага тэатру Галубка.

У Менску адчыніўся зімовы сэзон Беларускага Дзяржаўнага Вандроўнага Тэатру пад кіраўніцтвам Галубка. Першая пастаноўка адбылася 8-га верасьня ў Доме Працасьветы. Характар вечару быў канцертны. Апроч п'есы ў 1-й дзеі „Бабы-ліквідзейкі" адбыўся вялікі канцэрт у 2 частках. У рэпэртуары хору вызначаліся новыя сьпевы, якія зрабілі добрае ўражаньне на слухачоў. Таксама трэба адзначыць добрае выкананьне беларускіх нацыянальных танцаў, асабліва танца «Лубок». Чарговыя пастаноўкі адбудуцца ў Доме Працасьветы. Пойдуць п'есы «Падкідыш» і «Краб».

Перадача сьцягу рабочым с.-г. майстэрняў імя Бурбіса.

Рульскія рабочыя (Нямеччына) зараз рыхтуюць сьцяг для перадачы рабочым сельска-гаспадарчых майстэрняў імя Бурбіса.

Для перадачы гэтага сьцягу ў нарыхлібах кастрычніка з Рулы прыяжджае прадстаўнік. Рабочыя сельска-гаспадарчых майстэрняў імя Бурбіса таксама рыхтуюць сьцяг для перадачы рульскім рабочым.

Усебеларуская нарада па барацьбе з сухотамі.

9-10-га верасьня адбылася Ўсебеларуская Нарада па барацьбе з сухотамі. У нарадзе прымелі ўдзел загадчыкі сухотных акруговых дыспансэраў. Нарада выпрацавала цэлы шэраг мерапрыемстваў па барацьбе з сухотамі. Учора, 10-га верасьня, усе ўдзельнікі нарады выехалі на ўсесаюзны зьезд па барацьбе з сухотамі, які адчыняецца ў Тыфлісе.

Фінансаваньне прамысловасьці.

Беларускае аддзяленьне Дзяржбанку вызначыла 650000 руб. для фінансаваньня фонду прамысловых тавараў.

Паказаная сума разьмяркована наступным чынам: Белкаапсаюзу—300000 руб., Дубровенскай фабрыцы—175000 руб., Беларускаму шкляному трасту—75000 руб., Якаўлевіцкай фабрыцы—40000 руб., Белпайгандлю—45000 руб. і 15000 руб. застаецца ў выглядзе рэзэрву.

Сельская гаспадарка.

Сяўба праходзіць здавальняюча.

Гэтымі днямі пры Калегіі Наркамзему закончылася нарада загадчыкаў акруговых зямельных аддзелаў па пытаньню аб асеньняй сяўбе. З дакладаў высьвятлілася, што ўсюды ўжо праводзіцца сяўба азіміны. Ва ўсіх акругах праходзіць зараз адгрузка жыта з Украіны, насельніцтва больш-менш забясьпечана насеньнем здавальняюча, саўгасы праводзяць абмен насеньня.

З прычыны недахопу насеньня ў Віцебшчыне, для гэтай акругі дадаткова вызначана 10 тысяч пуд. жыта з саўгасаў Белсельтрэсту.

Нарада адзначыла, што кантрактацыя жыта праходзіць здавальняюча толькі ў Гомельшчыне.

Падрыхтоўка да бэканізацыі.

Для хутчэйшага праведзеньня бэканізацыі ў Менскай акрузе будуць арганізаваны злучныя пункты для сьвіней у наступных раёнах: Койданаўскім, Самахвалавіцкім і Грэскім. У кожным з гэтых раёнаў будуць арганізаваны па 10 злучаных пунктаў.

Дасьледаваньне каня-водзтва.

У Пухавіцкім, Чэрвенскім, Бярэзінскім і Бягомальскім раёнах, Менскай акрузе, будзе праведзена абсьледаваньне конскага стада. Абсьледаваньне распачнецца 20-га верасьня.

Экспартныя навіны

Загатоўка жывой і бітай птушкі па БССР.

Наркамгандаль БССР зацьвердзіў плян па загатоўцы і экспарту жывой і бітай птушкі.

Белсельсаюз павінен загатовіць 170 тысяч бітых гусей. Адкорм курэй, у колькасьці 144 тыс. штук, павінен быць зроблен Белдзяржгандлем, прычым Белсельсаюз абавязан загатовіць для Белдзяржгандлю 72 тысячы курэй (жывых).

У сувязі з выкананьнем экспартнага пляну па загатоўцы гусей, Наркамгандаль БССР ускладае на Белсельсаюз заданьне загатоўленых у Віцебскай і Полацкай акругах гусей здаць Белдзяржгандлю.

Да асеньняй кампаніі па загатоўцы яек.

Белдзяржгандаль ужо распачаў экспарт яек. Пасьля 2-хмесячнага перапынку ў пунктах Белдзяржгандлю пачалі зьяўляцца асеньнія яйкі, якія ў бліжэйшыя дні будуць адасланы ў Кёнігзбэрг (Нямеччына). Вясеньняя кампанія па загатоўцы яек прайшла з вялікім посьпехам. Заданьне выкананa вышэй зацьверджанага экспартнага пляну.

Экспарт другарадных відаў лесу.

Экспарт другарадных відаў лесу Белдзяржгандлем праводзіцца пасьпяхова. Кожны дзень у Нямеччыну адсылаюцца дубовыя кражы і іншыя віды лесаматэрыялаў.

Апроч таго, у апошні час экспартуецца за границу біндэрная клёпка, закупленая адной вялікай нямецкай фірмай у Белдзяржгандлі.

Узмацненьне экспарту лекавых расьлін.

За апошні месяц экспартавана значная колькасьць розных відаў лекавых расьлін, пераважна румянку, аерныя кораню, васількоў і інш. Белмодгандаль па заданьню Белдзяржгандлю таксама перадаў для экспарту значную партыю кары крушыны, румянку і інш. Лекавыя травы экспартуюцца пераважна ў Гамбург (Нямеччына).

Сярод літоўцаў.

Новы літоўскі лікпункт.

З надыходзячага навучальнага году Аршанскі акруговы інспэктарыят нарасьветы адчыняе ў вёсцы Чырвоная Слабада, Чарэйскага раёну „новы літоўскі лікпункт. Усяго ў лікпункт будзе прынята каля 25 чалавек.

Забясьпечаньне падручнікамі літоўскіх школ.

Беларускае Дзяржаўнае Выдавецтва заказала ў Літве літоўскія кнігі. Гэтыя кнігі пойдуць для забясьпечаньня літоўскіх школ, лікпунктаў, хат-чытальняў і іншых палітасьветных установаў.

Першы літоўскі с.-г. калектыў у БССР.

У БССР арганізаваўся першы с.-г. калектыў з сялян-літоўцаў вёскі Сафійск, Лупалаўскага раёну, Магілеўскай акругі. Восьвеньню бягучага году калектыў прыступіць да калектыўнай заашоўкі. У калектыў увайшло 8 літоўскіх сем'яў.

Бібліятэчкі для чырвоных куткоў.

Беларускае Дзяржаўнае Выдавецтва зараз камплектуе для чырвоных куткоў, якія існуюць пры літоўскіх школах, літоўскія бібліятэчкі каштоўнасьцю па 35 руб. кожная. Усяго будзе разасланa 19 бібліятэчак.

Акруговы зьезд т-ва „Прэч Няпісьменнасьць"

У хуткім часе ўва ўсіх акругах БССР адбудуцца акруговыя зьезды т-ва „Прэч няпісьменнасьць".

Мэта зьездаў—падагуліць маючыяся дасягненьні і недахопы у працы на ліквідацыі няпісьменнасьці.

Аповяшчэньні

— У сераду, 12-га верасьня, а 7-й гадз. увеч. у памяшканьні Акругкому МОПР'у адбудзецца пасяджэньне прэзыдыуму Акругкому МОПР'у. Прысутнасьць усіх сяброў прэзыдыуму абавязкова.

Запрашаюцца гар. актывісты МОПР'у.

ДОМ АСЬВЕТЫ.

Сёньня 11 верасьня кіно—„ТРИ МУШКЕТЕРА". Пачатак 1-га сэансу (для дзяцей) у 6 гадз. веч., II-га сэансу—у 8 гадз. III-га сэансу—у 10 гадз. Карціна сапраўдзецца музычным дуэтам. Білеты на 1-шы сэанс па 10 кап., II-гі і III-ці сэансы 10 і 15 к.

КОТОК ВУЧОНЫХ.

У сераду, 12-IX, а 6 гадз. увеч. пасяжэньне Ц5 сэкцыі.

Справачны аддзел.
КАТЫРОЎКА ПАЗЫК
(НА 11-IX-1928 г.).

Абл. 1 дзярж. паз. — прад. 4—72, куп. 4—70.
Абл. 2 дзярж. паз.—прад. 5—03, куп. 5—06.
Абл. 3 сял. паз.—прад. 5—05,5 куп. 5—03,5.
Абл. 10 пр. паз. 27 году — прад. 25,11 куп. 25—01.
Абл. дзярж. паз. 26 г.—прад. 121,00 куп. 119.00
Абл. 12 пр. дзярж. паз. прад. 103—36 куп. 103—31.
Абл. 6 проц. паз. індустр. прад. 25—28,5 куп. 25—18,5.

Часова вык. абав. адказнага рэдактара
П. ШАСТАКОЎ.

Супрацоўнікі аб'яднанай прафтэхшколы выказваюць глыбокае спачуваньне выкладчыку школы т. БЭРНШТЭЙНУ з прычыны сьмерці яго

СЯСТРЫ.

ЦЫРК-КІНО.

ЦЫРК Сёньня ЦЫРК
Вялікае прадстаўленьне з 3-х аддзяленьняў 15 нумароў.
1 гастроль буфанадных клёўнаў ЖАК і ЖАКОНІ, сатыра і юмар.
Апошняя разьвітальная гастроль бр. СЭРЖ—патройны жакей Трансфармацыя на каві. Першы раз ільвіны скок праз 5 коняў вык. СЭРЖ.
Толькі 2 дні выхад самага маленькага наезьніка—жакея СЛАВЫ СЭРЖ.
А таксама ўдзельнічае ўся трупа.
АНОНС: Едуць новыя гастралёры і замежныя атракцыёны.
Каса адчынена ад 11 да 3 гадзіны дню і ад 5 да 9 гадзіны ўвечары.
Пачатак роўна а 8 в палов. гадзіне ўвечары.

КІНО-ТЭАТР «КУЛЬТУРА». Ад аўторка, 11 верасьня мастацкі фільм паводле раману О'Нэйля „ЖАНЧЫНА З КІРМАШУ" (Каханьне пад вязамі). У галоўных ролях Бэла Біленская і М. Шырот.

КІНО „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА". Ад аўторка 11 верасьня, ЮБІЛЕЙНЫ ФІЛЬМ да 100-х угодкаў нараджэньня Льва Мікалаевіча Талстога аповесьць „КАЗАКІ" пастаноўка рэжысэра В. Г. Барскага.
СЭАНСЫ—пачатак 1-га а 7 гадз. 30 хв., 2 — а 9 гадз., 3—а 10 гадз. 30 х. Каса адчынена ад 6 гадз.

КІНО «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ». Ад аўторка, 11 верасьня нямецкі баявік НЕБЯСЬПЕЧНЫ ЎЗРОСТ у 8 частках.
У галоўных ролях сусьветныя артысты: Бэрнард Гацке (вядомы па фільмах «Индийская гробница», „Женщина с миллиардами", «Доктор Мабузо», «Пасынки Берлина». Аста Нильсен («Безрадостная улица»).
Пачатак 1-га сэансу а 7 г. 30 хв. Каса адчынена ад 6 г.

КІНО «ПРАЛЕТАРЫ». З аўторка, 11 верасьня „ПАТ І ПАТАШОН".

С. С. С. Р.
ВЫШЭЙШЫ САВЕТ НАРОДНАЙ ГАСПАДАРКІ
Дзяржаўнае Кансультацыйна-Тэхнічнае Будаўнічае Бюро
«Стройконсультация»

ПРЫМАЕ НА СЯБЕ:
а) Вытворчасьць усякага роду тэхнічна-будаўнічых абсьледаваньняў і экспертызаў, адшуканьняў геадэзічных, гідрамэтрычных і дасьледаваньне грунтаў;
б) складаньне праэктаў, каштарысаў, справаздач і разрахункаў, моцнасьці і ўстойлівасьці пабудаваньняў і інш.;
в) кансультацыю па пытаньнях тэхнікі і арганізацыі будаўнічых работ;
г) па даручэньнях і ад імя будуючых органаў, праверку разрахункаў і рахункаў, прыёмку будаўнічых работ і нагляд за правядзеньнем будаўнічых работ, выконваемых падрадным спосабам.
Адрас: Масква, Цэнтр, Салянка 1; телеграф. адрас: Масква, «Стройконсультация». Тэл. № № 5-60-82, 5-61-89, 5-62-21.
СТРОЙКАНСУЛЬТАЦЫЯ.

Вышаў з друку, рассылаецца падпісчыкам і паступіў у продаж
№ 6 „ПОЛЫМЯ" № 6
Беларуская часопісь літаратуры, палітыкі, эканомікі, гісторыі, крытыкі.
(СЁМЫ ГОД ВЫДАНЬНЯ)
Пад рэдакцыяй: З. Жылуновіча, Ів. Васілевіча, Янкі Купалы, М. Чарота, А. Баліцкага.
ЗЬМЕСТ:
Іоганэс Бэхэр. Адзіная справядлівая вайна—раман (канец); М. Зарэцкі Віхор на балоце—п'еса ў 4-х дзеях; Я. Лімановускі. Над абрывам—аповесьць; А. Радэевіч. Рабочы Тамаш—апавяданьне; Е. Пфляумбаум. Башкірка-двуўчына—верш; Ал. Салагуб. Ліпнёвай раніцай—верш; Ніля Жаркава. У сорнай аганьку—верш; Іоганэс Бэхэр. Сялянін у горадзе—верш; І. Гарчыкаў. Ліга Нацый; Праф. Ул. Пічэта. Польска-савецкія адносіны і Рыскі мір (канец); Д. Васілеўскі. Сялянства Віцебскай і Магілеўскай губэрань у паўстаньні 1863 году; А. Дайлідовіч. Сацыяльна-бытавыя матывы беларускіх народных казак; Ф. Вайсгопф. Аўтабіяграфія; Ф. Вайсгопф. Іоганэс Бэхэр—шлях рэвалюцыйнага пісьменьніка; Л. Варонін. Сьпісжкі-дарожкі (адносна раману М. Зарэцкага); Кнігапіс—А. Падбярэскі, А. Шлюбскі, М. Кр. Хроніка беларуск. культуры; Хроніка украінск. культуры, жыцьця.
ПРЫМАЕЦЦА ПАДПІСКА ДА КАНЦА ГОДУ
ГАДАВЫЯ І ПАЎГАДАВЫЯ ПАДПІСЧЫКІ „ПОЛЫМЯ", ЯКІЯ ЎЖО ЎНЕСЬЛІ ПЛАТУ, АТРЫМОЎВАЮЦЬ НУМАРЫ «ПОЛЫМЯ» ДА КАНЦА ГОДУ ПА РАНЕЙШАЙ РАСЦЭНЦЫ, А ТАКСАМА БЯСПЛАТНА ЛІТАРАТУРНЫ ДАДАТАК (ГЛ. ГАЗ. «САВ. БЕЛ» № 235 ЗА 1927 г. І „ЗЬВЯЗДА" АД 1 СТУДЗЕНЯ 1928 г.).
Падпісная цана па „Полымі" з дадаткам: на год—12 р., на 6 м-цаў—6 р., 3 м-цы—3 р.
Цана асобнага нумару—1 руб. 25 кап.
ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА: у рэдакцыі часопісі «Полымя» (Менск, Савецкая, 63). у центр. кнігарні БДВ (Менск, рог вул. Леніна і Савецкай). ва ўсіх акруговых аддзяленьнях БДВ. ва ўсіх паштовых аддзяленьнях, у галоўнай канторы газэты «Зьвязда» (Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх). у канторы падпіскі на газэты «Правда» і «Известия» (Менск, Савецкая, 61), у канторы газэты «Беларуская Вёска» (Менск, Савецкая, 63) і ве ўсіх уважаемых і селькорамі ва ўсіх раёнах БССР.
За ўсімі справкамі аб недасылцы падпісчыкам нумароў «Полымя» просьба зьвяртацца непасрэдна ў тыя ўстановы, якімі прымалася падпіска на часопісь «Полымя».

НАРОДНЫ КАМІСАРЫЯТ ГАНДЛЮ БССР
падае да агульнага ведама,
што 1-га верасьня 1928 г. ім унесен у другі падзел гандлёвага рэестру СССР (па БССР) пад № 28 трэст пад назвай
Дзяржаўны завод „КРАСНЫЙ ХИМИК"
Вышэйшы Савет Народнае Гаспадаркі БССР зацьвердзіў статут названага трэсту 20-га красавіка 1928 году (пратакол Прэзыдыуму № 31 п. 7 (308).
Кіраўніцтва трэсту ў асоба кіраўніка ў п. Новабеліца, Гом. акр.
Прадмет дзейнасьці—выраб хімічнай чыстай крэйды, а таксама збыт гатовай прадукцыі.
Статутны капітал вызначан у 216.703 р. 21 к.
Сакратар Наркамгандлю ВЕРАМЕЙЧЫК.

ЗАОЧНЫЕ КУРСЫ БУХГАЛТЕРИИ, КАЛЬКУЛЯЦИИ и СТАТИСТИКИ
— Продолжительность курса—8 МЕСЯЦЕВ. —
— Поступать на курсы можно в любой месяц года. —
Принимаются лица с образованием не ниже 4 гр. семилетки.
ОКОНЧИВШИМ КУРСЫ ВЫДАЮТСЯ СВИДЕТЕЛЬСТВА.
Плата за первый месяц—5 руб, а за остальные по 4 руб. в месяц ВНОСИТСЯ В НАЧАЛЕ КАЖДОГО МЕСЯЦА ВПЕРЕД по адресу: МИНСК, ВСЕКОБАНК, тек. счет № 682.
Подробные условия высылаются за 2 восьмикопеечные марки. С запросами обращаться: Минск, Всекобанк, заочным курсам.

Патрабуюцца агенты
для зьбіраньня падпіскі і распаўсюджаньня часопісі і кніг «УЗВЫШША».
УМОВЫ САМЫЯ ВЫГАДНЫЯ:
1. За падпіску на часопісь ад 1-га да 10-га камплекта — 50 к за камп.
2. За падпіску на часопісь ад 10-га да 25-га камплекта — 75 к. за камп.
3. За падпіску на часопісь ад 25-га да 50-га камплекта —1 р. 00 к. за камп.
4. За падпіску на часопісь ад 50-га да 100-га камплекта —1 р. 50 к. за камп.
5. За падпіску на часопісь ад 100-га і далей камплекта —2 р. 00 к. за камп.
Зьвяртацца штодзень ад 5 да 8 гадзіны ўвечары па адрасу:
Менск, Савецкая 63, 3 паверх, пакой рэдакцыі „Узвышша".
Тыя, што жывуць ня ў Менску, могуць паведаміць пісьмова аб сваім жаданьні быць агентамі.

Полацкі Акр. ЗАГС в. клікае грамадзянку Сегельету Картауну КРЫМЛІЯНЦ-ТАБАКІНУ на 5-X-28 г. а 12 гадзіне для слуханьня справы аб скасаваньні шлюбу з гр-нам ТАБАКІНАМ Антонам Восіпавым.

ЗГУБЛЕНЫ:
— Паявая кніжка № 2196, Кузьміцкага І., выд. Барыс. ЦРК, кв. 1182.
— Асабовая кніжка Ярыга І. П., выд. Пятрыкоўскім РВК, кв. 1183.
— Конская кніжка Высоцкага К., выд. Грэскім РВК, кв. 1184.
— Паявая кніжка № 3359 Семашка К., выд. Барыс. ЦРК, кв. 1185.
— Паявая кніжка № 4148 Леўчуга Ф., выд. Барыс. ЦРК, кв. 1186.
— Сябр. кніжка № 282360 Зобс Ф. П., выд. саюзам хэмікаў, кв. 1187.
— Асабовая картка № 35 Дабыш А. П. выд. Параўлянскім РВК, кв. 1188.
— Асабовая картка Носко Н. І., выд. Параўлянскім РВК, кв. 1189.
— Паявая кніжка № 1471 Барановускага П., выд. Чэрвенскім с.-тэам, кв. 1190.
— Каапэр. кніжка № 121 Фрэнкель М., выд. Параўл. с.-тэам, кв. 1191.
— Паявая кніжка № 1406 Грабліка І., выд. Чэрвенскім с.-тэам, кв. 1192.
— Асабовая кніжка № 178 Астравіка Е. выд. Тураўскім РВК, кв. 1193.
— Асаб. кніжка № 1469 Бяліновіча В., выд. Бярэзінскім РВК, кв. 1194.
— Сябр. білет № 8253, выд. Халопеніцкім Агракомам і конская кніжка № 15, выд. Халопеніцкім РВК, Кандрацевка Н., кв. 1195.
— Сябр. білет № 6-14467 Рабцова С. І., выд Барыс. саюзам будаўнікоў, кв. 1197.
— Вуч.-конская кніжка Ксяндзова Л. К., выд. Крупскім РВК, кв. 1197.
— Асаб. кніжка Ксяндзова Л. К., выд. 6. Бобрскім ВВК, кв. 1197.
— Асаб. кніжка Шкробава Ц. Д., выд. 6. Лошніцкім ВВК, кв. 1197.
— Асабов. кніжка Міганя Б. П., выд. Крупскім РВК, кв. 1197.
— Дапрызыўн. кніжка Якушова А. М., выд. Крупскім РВК, кв. 1197.
— Асабовая кніжка Маслакова С. С., выд. Чэрвенскім РВК, кв. 1198.
— Асаб. кніжка Любенкага Н. Л., выд. 6. Талочынскім ВВК, кв. 1199.
— З таленны Берковіч А. Л., выд. Менскай біржай працы, кв. 1200.
— Пашпарт № 1069 Берковіч А. Л., выд. Менакрміцыцкай, кв. 1201.
— Справка аб працы Берковіч А. Л., выд. прыватным прадпрыемст., кв. 1202.
— Студэнцкі білет № 22 Кучко А. І., выд. Белмодтэхнікумам, кв. 1203.
— З таленны Похаева З. В., выд. Менскай біржай працы, кв 1204.
— Каапэр. кніжка Швейдер А., выд. МЦРК, кв. 1205.
— Матрычны выпіс Войпенка І. В., выд. Сахонаўскім ВВК, кв. 1206.
— Таленн Брыдоўскага І. А., выд. Менскай біржай працы, кв. 1207.
— Пасьведчаньне № 52 Яцовіч Л. К., выд. Рабфакам, кв. 1208.
— Каапэр. кніжка № 2346 Дукар З. Г., выд. МЦРК, кв. 1209.
— Асаб. кніжка № 1207 Юшкевіча Ф. Р., выд. Плешчаніцкім РВК, кв. 1210.
— Справка № 1129 аб пакупцы лесаматэрыялу Зелякеўскага В. А., выд. Калкаўскім с.-с. кв. 1211.
— Паявая кніжка № 408 Баранчука П., выдан. Бобрскім с-тэам кв. 1196.
— Паявая кніжка № 867 Саванас А. А., выд. Бабрскім с-тэам кв. 1196.
— Паявая кніжка № 772. Горчыкава Е. Г., выд. Бобрскім с-тэам кв. 1196.
— Пасьведч. аб скончэньні школы № 107 Гара В. А., выд. Бобрскай 7